ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 74 (2023)
14 верасня 1965 г.
АУТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

МІНУЛАЕ ХВАЛЮЕ, МІНУЛАЕ ВЫХОЎВАЕ

Як ужо вядома, у Беларусі створан аргкамітэт добраахвотнага Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» сустрэўся са старшынёй аргкамітэта акадэмікам АН БССР Цімафеем Сазонавічам Гарбуновым і папрасіў яго адказаць на некалькі пытанняў.

Якое значэнне будзе мець у рэспубліцы Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры? Як вы ўяўляеце размах і задачы яго будучай работы?

— Безумоўна, стварэнне Таварыства наспела. Наша грамадскасць ужо не раз біла трывогу ў сувязі з тым, што ў рэспубліцы часам дрэнна ахоўваюцца помнікі гісторыі і культуры. Можна спаслацца на шматлікія пісьмы працоўных у дзяржаўныя ўстановы, выступленні пісьменнікаў, архітэктараў, рабочых і калгаснікаў у перыядычным друку. Працоўныя патрабуюць свята шанаваць усё, што звязана з гісторыяй нашага краю, абураюцца асобнымі выпадкамі абыякавага абыходжання з каштоўнымі помнікамі мінулага.

Гэтая заклапочанасць невыпадковая. Я павінен адзначыць, што яна перш за ўсё выклікана агульным ростам культуры нашых людзей, якія разумеюць, што мінулае народа—гэта нібы яго корані. Мы помнім, якім хваляваннем у грозныя дні 1941 года напоўніліся нашы сэрцы, калі разам з заклікам біць ворагаў прагучаў напамін пра слаўныя ратныя подзвігі Аляксандра Неўскага і Дзмітрыя Данскога, Суворава і Кутузава.

Баючыся зацягнуць адказ на ваша першае пытанне, усё ж не магу не сказаць і пра наступнае. Выношваючы вар'яцкія планы знішчэння цэлых народаў, асабліва славянскіх, Гітлер, між іншым, імкнуўся пераканаць нямецкі народ у тым, што славянскія нацыі, нібыта не здолелі стварыць сапраўднай культуры,—і таму іх трэба знішчаць, як ніжэйшую расу. Зараз знойдзены дакументы, у якіх гітлераўскім войскам прадпісвалася разбураць і знішчаць усё, што гаворыць аб культуры савецкіх народаў. І гэтае вар'яцкае ўказанне выконвалася. У нашай Беларусі за час вайны фашыстамі было знішчана больш пяцісот помнікаў гістарычнага і культурнага мінулага. Тым больш трэба берагчы тое, што народ выратаваў у барацьбе. Пра важнасць гэтай справы наўрад ці трэба доўга гаварыць. Сярод першых дэкрэтаў Савецкай улады быў ленінскі дэкрэт аб уліку, вывучэнні і ахове помнікаў гісторыі і культуры, а таксама аб як мага больш поўным азнаямленні з імі шырокіх мас насельніцтва. У гэтым напрамку за гады Савецкай улады зроблена многае. Але не ўсё магчымае. Больш таго, не будзе перабольшаннем сказаць, што часам недаацэньвалася важнасць гэтай работы. Яшчэ зусім нядаўна мы былі сведкамі, як скарачаліся спісы помнікаў, узятых пад ахову дзяржавы, як зачыняліся асобныя краязнаўчыя музеі. ЦК партыі зараз папраўляе становішча. Але вельмі многае яшчэ трэба зрабіць. І добра, што за гэтую справу бярэцца не толькі дзяржава, але і грамадскасць.

Мне заўсёды балюча было бачыць, як з-за недагляду гінуць часам каштоўныя помнікі мінулага. Тры гады назад у Віцебску гарадскія ўлады дабіліся выключэння са спісу помнікаў, узятых пад ахову дзяржавы, царквы Благавяшчання—помніка архітэктуры XII веку. сучасніцы «Слова аб палку Ігаравым». Знайшліся ў «вышэйшых інстанцыях» людзі, якія санкцыяніравалі гэтую просьбу. Царква была разбурана. А літаральна праз тры месяцы руіны былі ўзяты дзяржавай... пад ахову. У Магілёве знеслі сабор XVII стагоддзя разам з будынкам былога Кадэцкага корпуса, што абышлося дзяржаве ў 350 тысяч рублёў,—больш, чым каштавала б рэстаўрацыя помніка. Я не кажу ўжо аб тым, у якім стане знаходзяцца цяпер некаторыя помнікі мінулага, напрыклад, славутая «Сафійка» ў Полацку.

Нездарма (сорамна і гаварыць) вядомыя чэхаславацкія падарожнікі Зігмунд і Ганзелка, калі ў іх пасля наведання нашай краіны спыталі, што іх асабліва ўразіла ў нас, пачалі гаварыць пра нашу непавагу да помнікаў мінулага.

Стварэнне добраахвотнага Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры азначае прыцягненне да гэтай важнай работы шырокай грамадскасці. З яе дапамогай неабходна выявіць і ўзяць на ўлік усе нашы разнастайныя помнікі мінулага, аднавіць і рэстаўрыраваць тыя з іх, што маюць у гэтым патрэбу, трымаць іх заўсёды, як кажуць, на відавоку, ахоўваючы ад разбурэння і пашкоджання. Трэба як мага шырэй знаёміць людзей з помнікамі, прывіваючы—асабліва моладзі—любоў да слаўнай гісторыі нашай Радзімы.

Уся гэтая работа набывае асаблівае значэнне зараз, у перыяд падрыхтоўкі да знамянальных святаў—50-годдзя Савецкай улады, 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна і 50-годдзя Савецкай Беларусі.

Якой будзе арганізацыйная будова Таварыства! Як будзе ажыццяўляцца яго ўзаемасувязь з органамі дзяржаўнай аховы помнікаў мінулага!

— Зараз яшчэ цяжка сказаць пэўна пра структуру будучага Таварыства. Усё вырашыць устаноўчы сход Таварыства. Кіраваць арганізацыяй будзе, відавочна, рэспубліканскі савет, з ліку членаў якога для аператыўнай работы будзе абраны прэзідыум.

Зараз па сутнасці, адбываецца працэс нараджэння Таварыства. На прадпрыемствах, ва ўстановах, ву, калгасах ствараюцца пярвічныя арганізацыі. Да канца года павінны прайсці

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ДЫПЛОМЫ—ЛЕПШЫМ НАРОДНЫМ УНІВЕРСІТЭТАМ

У Маскве адбылося пасяджэнне аргкамітэта ўсесаюзнага грамадскага агляду народных універсітэтаў. Аргкамітэт падвёў вынікі агляду, які праходзіў з кастрычніка 1964 года па май 1965 года.

За поспехі ў пастаноўцы вучэбна-выхаваўчай работы, шырокае развіццё грамадскіх асноў і актыўны ўдзел ва ўсесаюзным грамадскім аглядзе лепшыя народныя універсітэты ўзнагароджаны дыпломамі і ганаровымі граматамі аргкамітэта. Дыпломамі адзначаны 48 народных універсітэтаў Беларускай ССР. Сярод дыпламантаў першай ступені — народны універсітэт мастацкага выхавання пры Гомельскім Палацы культуры імя У. І. Леніна. Восем універсітэтаў ўзнагароджаны ганаровымі граматамі аргкамітэта.

За актыўны ўдзел ў дзейнасці народных універсітэтаў ганаровымі граматамі ўзнагароджаны Рэспубліканскі грамадскі савет народных універсітэтаў (старшыня акадэмік АН БССР К. І. Лукашоў), юрыдычны факультэт БДУ імя У. І. Леніна, Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, сярэдняя школа № 1 г. Ляхавічы, Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна, рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия», праўленне Саюза мастакоў БССР і рад іншых калектываў, арганізацый, устаноў і творчых саюзаў.

БЕЛТА.

МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА Ў ВЁСЦЫ

У калгасе «Камуніст» Кіраўскага раёна гасцінна адчыніла дзверы музычная школа. 20 дзяцей калгаснікаў будуць авалодваць тут ігрой на народных музычных інструментах.

Школа будзе працаваць на сродкі арцелі.

Л. ЦЫГАНКОЎ.

З ПЕСНЯЙ ПА КАЛГАСАХ

Да хлебаробаў калгаса «Кастрычнік» у вёску Пліса прыехала агітмашына. Самадзейныя артысты Глыбоцкага раённага Дома культуры падрыхтавалі калгаснікам цікавы канцэрт.

Канцэрт атрымаўся разнастайным. У праграме агітбрыгады — інтэрмедыі, песні, музычныя нумары, мастацкае чытанне, сатырычныя прыпеўкі, танцы.

Агітбрыгада Глыбоцкага РДК — часты госць у калгасах раёна. У час уборкі ўраджаю самадзейныя артысты выступалі ў калгасах «Герой працы», «17 верасня», «Беларусь», «Перамога», імя Чапаева і іншых гаспадарках раёна.

М. БЕЛЬСКІ.

СЯРОД ПЕРАМОЖЦАЎ

Калегія Міністэрства культуры СССР і прэзідыум Цэнтральнага савета Саюза спартыўных таварыстваў і арганізацый СССР падвялі вынікі Усесаюзнага агляду паркаў культуры і адпачынку на лепшую арганізацыю масавай фізкультурна-аздараўленчай работы, якая праводзілася ў парках у 1964—65 гадах.

Сярод лепшых паркаў краіны дыпломам першай ступені Цэнтральнага савета Саюза спартыўных таварыстваў і арганізацый СССР узнагароджаны гомельскі парк культуры і адпачынку імя Луначарскага, брэсцкі парк культуры і адпачынку імя Першага мая.

Дыпломам другой ступені ўзнагароджаны мінскі дзіцячы парк імя Горкага і віцебскі — імя Фрунзе.

Кобрынскі і Баранавіцкі паркі культуры і адпачынку ўзнагароджаны дыпломамі трэцяй ступені.

Улічваючы добрыя вынікі Усесаюзнага агляду паркаў культуры і адпачынку, вырашана прадоўжыць агляд у 1965—66 гадах.

«ДЗЕНЬ ДОБРЫ, ГАЙДАР!»

Фільмы па творах Гайдара — адны з самых папулярных сярод дзяцей. Не знойдзеш школьніка, які б не глядзеў «Цімура і яго каманду», «На графскіх руінах», «Лёс барабаншчыка»... Вось чаму, калі афішы Віцебска паведаміле аб «гайдараўскім» кінафестывалі, у адрас кінатэатраў пачалі паступаць шматлікія заяўкі ад школ.

Фестываль адкрыўся ў кінатэатры «Спартак» новым каляровым шырокаэкранным фільмам «Казка пра Мальчыша-Кібальчыша».

Фестываль пройдзе таксама ў Оршы. Тут будуць адкрыты фотавыстаўкі, вучні выступяць з літаратурна-музычнымі мантажамі.

Валянціна Сакалоўская працуе, як ювелір — уважліва, асцярожна. Ды інакш, відаць, тут і нельга. Вельмі тонкая і складаная гэта работа — сабраць тэлерадыёпу «Беларусь-110». Затое, калі сыдзе яна гатовай з канвеера, нельга не залюбавацца ёю.

На Мінскім радыёзаводзе Валянціну ведаюць не толькі як старанную работніцу. Яна яшчэ і актыўная ўдзельніца мастацкай самадзейнасці. Дзяўчына часта спявае ў суправаджэнні эстраднага аркестра.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

ДЭКАДА БАЛГАРСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ

Гасцінна сустрэлі балгарскіх сяброў у калгасе «Рассвет» Кіраўскага раёна. Ад імя ўсіх калгаснікаў Герой Сацыялістычнай Працы даярка Феадосія Фёдараўна Кісялёва паднесла гасцям з Балгарыі хлеб-соль.

Фота А. ЛУКАШОВА.

З БРАТНЯЙ ЛЮБАСЦЮ Ў СЭРЦАХ

Як дарагіх гасцей сустракае наша рэспубліка прадстаўнікоў культуры братняга балгарскага народа. 10 верасня ў Мінску адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 21-й гадавіне сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі і адкрыццю Дэкады балгарскай культуры ў Беларусі. У канцэртную залу Беларускай дзяржаўнай філармоніі, упрыгожаную дзяржаўнымі флагамі Народнай Рэспублікі Балгарыі, Савецкага Саюза і Беларускай ССР, сабраліся рабочыя і служачыя прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў, партыйныя і савецкія работнікі, дзеячы навукі і культуры, моладзь беларускай сталіцы.

За сталом прэзідыума — кіраўнікі Камуністычнай партыі і ўрада Беларусі, прадстаўнікі творчых арганізацый і шырокай грамадскасці сталіцы рэспублікі.

Апладысменты ўспыхваюць у зале, калі ў прэзідыуме з'яўляюцца дарагія госці — Надзвычайны і Паўнамоцны пасол НРБ у СССР Стаян Караджаў, кіраўнік дэлегацыі дзеячоў культуры міністр народнай асветы НРБ Ганча Ганеў, кіраўнік дэлегацыі ветэранаў балгара-савецкай дружбы Георгій Бакалаў і іншыя пасланцы братняга балгарскага народа.

Кароткім уступным словам адкрывае вечар першы сакратар Мінскага гаркома КПБ Л. П. Мятліцкі. Слова бярэ намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР А. І. Золаў. Ён расказвае пра вялікія поспехі працоўных Народнай Балгарыі, пра вялікую дружбу савецкага і балгарскага народаў і той уклад, які ўносяць у гэтую дружбу працоўныя Беларусі.

З гарачым прывітаннем звяртаюцца да гасцей наладчыца трактарнага завода Герой Сацыялістычнай Працы Р. К. Прусава, студэнтка Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна Люба Сідзюк.

Паэт Ніл Гілевіч расказвае аб развіцці творчых сувязей паміж балгарскімі і беларускімі літаратарамі, прыгадвае незабыўныя яркія ўражанні аб сваіх сустрэчах з балгарскімі пісьменнікамі на іх гасцінная зямлі.

У канцы ўрачыстасці цёпла сустрэтыя прысутнымі выступаюць міністр народнай асветы НРБ Ганча Ганеў і Надзвычайны і Паўнамоцны пасол НРБ у СССР Стаян Караджаў.

Вечар заканчваецца канцэртам майстроў мастацтва Балгарыі і Беларусі.

У гэты ж дзень балгарскія госці прысутнічалі на прэс-канферэнцыі, якую ў сувязі з Дэкадай балгарскай культуры ў Беларусі арганізавала Беларускае аддзяленне Таварыства савецка-балгарскай дружбы.

10 верасня балгарскія госці наведалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і ўсклалі вянкі да падножжа помніка-абеліска воінам Савецкай Арміі і партызанам Беларусі, якія загінулі ў баях за вызваленне Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У другі дзень Дэкады госці з братняй краіны працягвалі сустрэчы з працоўнымі рэспублікі, знаёміліся з іх жыццём і працаю.

Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Балгарскай Народнай Рэспублікі ў СССР Стаян Караджаў з жонкай і першы сакратар пасольства Уладзімір Недзялкоў наведалі Беларускі дзяржаўны універсітэт імя Ул. І. Леніна. Адбылася цёплая, сардэчная гутарка са студэнтамі і супрацоўнікамі яго.

Госці пабывалі ў бібліятэцы БДУ, у якой да Дэкады адкрыта вялікая кніжная выстаўка, пазнаёміліся з калекцыямі музея гістарычнага факультэта, лабараторыямі фізічнага факультэта, універсітэцкім вылічальным цэнтрам.

У гэты ж дзень мінскія трактаразаводцы па-братэрску сустракалі дэлегацыю ветэранаў рэвалюцыйнага руху і актыўных барацьбітоў за ўмацаванне балгара-савецкай дружбы, якую ўзначальвае Георгій Бакалаў.

Балгарскія госці пабывалі ў цэхах завода, азнаёміліся з арганізацыяй вытворчасці, работай асобных участкаў. Старшыня аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы на Мінскім трактарным заводзе М. І. Літвінаў расказаў ім аб рабоце аддзялення, падзяліўся планамі на будучае.

— Нам вельмі прыемна бачыць вялікія поспехі беларускага народа,—сказаў адзін з ветэранаў балгарскага рэвалюцыйнага руху Мікол Ефімаў.—Радасна ўсведамляць, што гэтаму садзейнічае вялікая дружба паміж нашымі краінамі.

Балгарскія ветэраны рэвалюцыйнага руху наведалі Дом-музей I з'езда РСДРП.

У гэты ж дзень госці з Балгарыі пабывалі ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР, азнаёміліся з выдатнымі мясцінамі Мінска.

Салісты эстраднага аркестра Балгарскага радыё і тэлебачання 11 верасня сустрэліся са сваімі беларускімі калегамі ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Лаўрэат Міжнароднага фестывалю моладзі і студэнтаў, саліст Белдзяржфілармоніі цымбаліст Веніямін Бурковіч, саліст філармоніі спявак Эдуард Міцуль і піяніст Леў Молер выканалі для гасцей некаторыя творы беларускіх кампазітараў.

У мінулую нядзелю ў мінскім парку культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў адбылося масавае гулянне, прысвечанае Дэкадзе балгарскай культуры.

Дэкада балгарскай культуры ідзе па ўсёй нашай рэспубліцы.

У Магілеве адкрыты фотавыстаўкі «Народная Рэспубліка Балгарыя», выстаўка рэпрадукцый карцін балгарскіх мастакоў, стэнды аб прыродзе і эканоміцы братняй краіны. У дамах культуры заводаў штучнага валакна, пад'ёмна-транспартнага абсталявання і іншых прадпрыемстваў пачалі працаваць лекторыі «Наш друг Балгарыя». Ва ўсіх кінатэатрах дэманструюцца балгарскія фільмы, у школах праводзяцца ўрачыстыя лінейкі, канцэрты мастацкай самадзейнасці.

У магілёўскай гарадской бібліятэцы імя Карла Маркса падрыхтавана вялікая кніжная выстаўка, складзен рэкамендацыйны спіс твораў балгарскіх пісьменнікаў, рыхтуецца вечар балгарскай паэзіі.

Для ўдзелу ў мерапрыемствах Дэкады балгарскай культуры ў Беларусі ў Магілёў прыехалі балгарскія сябры—вучоны сакратар Балгарскай Акадэміі навук Стойка Божкаў, член Усенароднага камітэта балгара-савецкай дружбы, Герой Сацыялістычнай Працы НРБ Іван Кінаў, вядомыя салісты Сафійскай оперы Асен Селімскі і Пеця Іванава.

12 верасня тут адбыўся гарадскі ўрачысты вечар савецка-балгарскай дружбы.

З раніцы ў нядзелю госці знаёміліся з выдатнымі мясцінамі старажытнага горада над Дняпром, а затым выехалі ў калгас «Рассвет» Кіраўскага раёна.

Прывітальнымі лозунгамі на вуліцах, плошчах, у парках сустрэў дарагіх гасцей — дзеячоў культуры Балгарыі на чале з міністрам народнай асветы НРБ Ганча Ганевым — Віцебск.

У суботу ў Беларускім драматычным тэатры імя Якуба Коласа адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 21-й гадавіне сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі і Дэкадзе балгарскай культуры ў БССР. На вечары з дакладам пра поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ў Балгарыі выступіла сакратар гарадскога камітэта партыі В. П. Мяцеліца. Гасцей горача віталі загадчык кафедры Віцебскага педагагічнага інстытута імя Кірава Е. К. Матлін, удзельнік баёў за вызваленне Балгарыі, кавалер ордэна «Айчынная вайна Балгарыі» работнік завода радыёдэталей І. А. Фефілаў, сакратар гарадскога камітэта камсамола В. П. Красянкоў.

Цёпла сустрэты прысутнымі, на вечары выступіў кіраўнік дэлегацыі міністр народнай асветы НРБ Ганча Ганеў.

12 верасня члены дэлегацыі прыйшлі ў госці да юных ленінцаў у абласны Палац піянераў. Тут яны агледзелі народны музей Ул. І. Леніна, пазнаёміліся ў студыі выяўленчага мастацтва з работамі юных мастакоў, пабывалі ў радыёлабараторыі, кабінеце мадэліравання, фотастудыі, клубе інтэрнацыянальнай дружбы, дзіцячай спартыўнай студыі і іншых гуртках палаца.

Удзень на Цэнтральнай плошчы імя Леніна адбылася лёгкаатлетычная эстафета дружбы, у якой прынялі ўдзел сотні спартсменаў, увечары члены дэлегацыі пабывалі ў Палацы культуры чыгуначнікаў. Тут адбыўся маладзежны вечар савецка-балгарскай дружбы.

Учора ў Мінску ў памяшканні Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, адбыўся вечар, прысвечаны балгарскай літаратуры.

Беларускія літаратары горача віталі дарагога госця — галоўнага рэдактара часопіса «Болгаро-советская дружба» пісьменніка Ангела Тодарава. Цёплым, пранікнёным словам вечар адкрыў старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, лаўрэат Ленінскай прэміі Пятрусь Броўка.

Паэт і літаратуразнаўца Ніл Гілевіч—аўтар шматлікіх перакладаў на беларускую мову твораў балгарскіх пісьменнікаў расказаў у сваім дакладзе пра шырокія жыватворныя сувязі дзвюх братніх літаратур. Паэтэса Эдзі Агнянцвет падзялілася ўражаннямі аб паездцы па балканскай краіне, расказала аб сваёй працы над перакладамі твораў балгарскіх літаратараў.

Ангел Тодараў, які выступіў на вечары, паведаміў, што толькі ў гэтым годзе ў Балгарыі выйшлі ў перакладах на балгарскую мову зборнік выбранай лірыкі Пімена Панчанкі, кніжка Васіля Быкава, раман Івана Шамякіна «Сэрца на далоні».

Па матэрыялах БЕЛТА.

У мінулую суботу ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі адбылася сустрэча члена дэлегацыі дзеячоў культуры Балгарыі, пісьменніка Ангела Тодарава з нашымі літаратарамі. Балгарскага сабрата па пяру горача віталі П. Броўка, І. Шамякін, Т. Хадкевіч, П. Кавалёў, А. Макаёнак, П. Панчанка, В. Вітка, А. Русецкі, Н. Гілевіч і інш. Паміж балгарскім госцем і беларускімі пісьменнікамі адбылася сяброўская гутарка аб развіцці і дружбе дзвюх братніх літаратур.

На здымку, які зрабіў наш фотакарэспандэнт Ул. Крук, вы бачыце Ангела Тодарава, Івана Шамякіна і Петруся Броўку ў адзін з момантаў сустрэчы.

ПАКУЛЬ ІДУЦЬ СПРЭЧКІ...

Сяды-тады на другім паверсе ў вокнах мураванага будынка ў вёсцы Бердаўка загараўся аганёк. Але не вабіў ён людзей да сябе. Вяскоўцы добра ведалі, што там, у клубе, холадна і няўтульна. Праз разбітыя шыбы гойсае зоўкі вецер, забіваючы іскрынкі снегу. Снег трапляе і на гарышча праз дзіркі ў даху і, калі надыходзіць адліга, са столі цячэ. Ды ад аднаго толькі выгляду клуба працінаў холад: сцены абшарпаныя, столь прагніла, усюды бруд і смецце. На вёсцы ўсюды электрычнасць, а ў клубе па-ранейшаму капцяць газавыя «васьмерыкі»...

Так было мінулай зімой.

Так не павінна б быць сёлетняй.

Але карціна паўтараецца. І па сённяшні дзень Бердаўскі сельскі клуб ніхто рамантаваць не думае. Клуб належыць дзяржаўнай племянной станцыі, аднак знаходзіцца на ўтрыманні сельскага Савета—і пачынаецца старая песня:

— Няхай рамантуе клуб станцыя, у нас сродкаў няма,—кажа старшыня сельсавета тав. Хоміч.

— Няхай рамантуе сельсавет, — заяўляе дырэктар племянной станцыі тав. Козел.

Адным словам, Іван ківае на Пятра, а справа не рухаецца ні на крок.

З вялікім боем правялі ў клуб электрычнасць, павесілі... адзіную лямпачку. На ацяпленне памяшкання неабходна не менш 10 кубаметраў дроў і 15 тон брыкету. Не завезена пакуль што ніводнага кубаметра дроў, ніводнай тоны брыкету. Відаць, тав. Козел забыўся, што за бесклапотныя адносіны да культустановы (гэта значыць да людзей!) у пастанове бюро райкома партыі і выканкома раённага Савета дэпутатаў працоўных яшчэ ў маі ён быў папярэджаны...

Жучкоўскі сельскі клуб. Ён лічыцца адрамантаваным. Сапраўды, тут пафарбавана столь, пабелены сцены. Але ж столь свеціцца, як рэшата. Не замураваны шчыліны на сцэне, не падрыхтаваны падвойныя рамы. Ніхто не звярнуў увагі і на тое, што дымяць печы.

Я пацікавіўся ў загадчыцы клуба Браніславы Ненартовіч, колькі ўжо завезена паліва.

— Тры тоны брыкету,—адказала яна. — Гэта толькі для ацяплення нашай бібліятэкі. Для клуба трэба хоць бы тон пятнаццаць.

Вядома, і пятнаццаці тон мала, каб ацяпліць такое прасторнае памяшканне (клуб да таго ж цагляны).

Зноў паўстае пытанне: хто будзе яго завозіць? Старшыня сельсавета тав. Рахман скардзіцца, што няма сродкаў, а старшыня калгаса тав. Галемполь ківае на сельсавет. Зачараванае кола!..

Увогуле, у тым, што многія культасветустановы Лідскага раёна не падрыхтаваліся да зімы, вінаваты такія вось «мантэкі і капулеці». Сапраўды, у сельскіх Саветаў, у раённага аддзела культуры не заўсёды хапае сродкаў, каб адрамантаваць клуб, бібліятэку, забяспечыць іх палівам. Але ж асяродкі культуры знаходзяцца на тэрыторыі калгасаў, саўгасаў, многія належаць ім. І калі, як не зімой, у калгасніка, рабочага саўгаса больш вольнага часу, калі, як не зімой, яны могуць часцей прыходзіць у клуб, бібліятэку? Дык чаму некаторыя кіраўнікі гаспадарак не дбаюць пра культурны адпачынак сваіх працаўнікоў?

Вось што ўяўляе сабой Дом культуры калгаса «Беліца». Паўразбураная трухлявая хата. Дзіркі ў даху, вокны выбіты, усюды бруд і беспарадак. Такое непрывабнае «дзецішча» знаходзіцца на ўтрыманні раённага аддзела культуры. Сёлета яго вырашылі «адрадзіць». У пачатку гэтага года раённы аддзел культуры заключыў дагавор з Лідскім рамонтна-будаўнічым упраўленнем на яго рамонт. Усе работы павінны былі закончыцца ў маі. Але і дагэтуль ніхто і пальцам не паварушыў—падвялі будаўнікі.

Глядзіш на гэтую сірочую хату і думаеш: ну, няхай нават адрамантуюць яе, навядуць парадак, аднак, якая ж яна цесная! А вёска Беліца, бадай, самая вялікая ў раёне—звыш 300 двароў. Няўжо ні разу не задумваўся старшыня калгаса Уладзімір Аляксандравіч Даніловіч, што хлебаробы хочуць адпачываць культурна? Няўжо не ўзнікла ні разу ў яго думка пабудаваць свой клуб? Раённы аддзел культуры прапаноўваў дапамагчы ў будаўніцтве, аддаваў сродкі, што адпушчаны сёлета на капітальны рамонт. Летась за 500 рублёў паставілі ў Доме культуры тры печы, за такую ж суму купілі крэслаў... Далібог, не варта аўчынка выдзелкі...

У раёне сёлета меркавалі, што не менш, чым пяць новых клубаў запросяць зімой да сябе хлебаробаў. Аднак новыя клубы адкрыліся толькі ў вёсцы Дакудава і ў саўгасе «Тарнова». Замаруджана будуюцца яны ў вёсках Паперня, Парэчча, Вялікае Сяло.

Шмат жа культасветустаноў у раёне знаходзіцца ў прыватных непрыстасаваных памяшканнях. Гэта звычайна невялічкія, цесныя пакоі ў хатах, пры канторах калгасаў. Праўда, у іх перад сапраўднымі клубамі ёсць свая «перавага». Зімою — не трэба многа паліва, калі ўжо збярэцца сюды народ у кіно або на лекцыю, можна ўпарыцца.

Вось чаму, калі загадчык Лідскага аддзела культуры Якаў Сямёнавіч Вальтман сказаў мне, што 28 культасветустаноў з 50 забяспечаны палівам, дык большасць з гэтых 28 складалі іменна такія клубы-карлікі. Так, ён паведаміў, што ў Дакудаве клуб забяспечан брыкетам. Але ж які клуб? Той, што быў раней у прыватным памяшканні. А новы—не забяспечаны. Не завезена дагэтуль паліва і ў іншыя клубы.

Вядома, было б няправільна ўскладваць усю віну за дрэнную падрыхтоўку культасветустаноў раёна да работы ў зімовых умовах на раённы аддзел культуры і, у прыватнасці, на яго загадчыка тав. Вальтмана. Загадчыку аддзела культуры вельмі часта даводзіцца выступаць у ролі нейкага «штурхача», упрошваць кіраўнікоў гаспадарак, сельсаветаў прывесці свае культасветустановы ў належны стан. Раней, вясной і ў пачатку лета, яны суцяшалі—куды спяшацца, паспеем, адрамантуем, забяспечым. Зараз жа адмахваюцца—не да клубаў, у першую чаргу трэба ўраджай убраць. Упусцілі многія кіраўнікі спрыяльны час для рамонту ўстаноў культуры, не забяспечылі іх палівам, неабходнай мэбляй, інвентаром. А яшчэ ж у маі былі распрацаваны мерапрыемствы па падрыхтоўцы ўстаноў культуры да зімы па кожнай гаспадарцы паасобна, была створана спецыяльная камісія на чале з намеснікам старшыні райвыканкома тав. Баранавым. Неўзабаве камісія павінна падвесці вынікі. Ёй давядзецца канстатаваць мноства недахопаў у падрыхтоўцы сельскіх клубаў і бібліятэк да зімы.

Пакуль яшчэ ёсць час, трэба выпраўляць становішча. Сельскія клубы і бібліятэкі чакаюць цеплыні, цеплыні ў шырокім разуменні гэтага слова.

С. БЛАТУН,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».
Лідскі раён.

ДЭКАДА БАЛГАРСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ

ПЕСНІ - СЁСТРЫ

Г. ЦІТОВІЧ,
народны артыст БССР

Восень 1935 года. Вільнюс. Універсітэт... Пасля сумнай лекцыі па тэорыі верагоднасцей вяртаюся ў інтэрнат, каб заняцца больш прыемнай для сябе справай — упарадкаваннем запісаў беларускіх народных песень, сабраных за летнія канікулы.

На мностве раскіданых па стале нот знаходжу паведамленне на каштоўную бандэроль з... Плоўдзіва. «Пэўна, нейкая памылка», — думаю я. Бо з Плоўдзівам у мяне няма ніякіх сувязей. Здзіўлены, спяшаюся на пошту, дзе мне ўручаюць цяжкі пакунак. Тут жа яго раскрываю і знаходжу ў ім апошняе выданне радопскіх песень А. Букарашчліева. А з пакладзенай у кнігу запіскі даведваюся, што высылае мне гэты зборнік мой аднакурснік па універсітэту Валодзя Ш., які для заканчэння сваёй дысертацыі аб казанлыкскай ружы і новай тэхналогіі здабычы ружавага масла, быў камандзіраваны ў Балгарыю.

Адклаўшы ўсе свае справы, пачаў знаёміцца са зборнікам. Гэта была мая першая сустрэча з балгарскай народнай песняй. Прагледзеў першы дзесятак запісаў — і раптам заўважыў, што, нягледзячы на незвычайную для нас складанасць рытмікі, у мелодыцы і ладавай структуры некаторых песень шмат агульнага з беларускім музычным фальклорам. Тут, як і ў нас, шмат узораў у натуральным міноры з падкрэсленай у напеве сёмай ступенню, даволі часта сустракаецца міксалідыйскі лад.

А калі дайшоў у раздзеле жніўных песень да 238 нумара, дык сваім вачам і вушам не паверыў: перада мною была тыповая беларуская жніўная песня. Потым я не раз эксперыментаваў з гэтым фальклорным напевам перад знаўцамі народнай песнятворчасці ў вёсцы і ў горадзе, напяваючы яго без слоў, і ўсе пазнавалі ў ім беларускую жніўную песню. А калі гэты напеў без падтэкстоўкі я супастаўляў з яго беларускім «блізнюком» (таксама не падтэкставаным) і прапаноўваў нашым кампетэнтным музыкантам вызначыць, які з іх беларускі, а які балгарскі, дык у большасці выпадкаў яны прызнавалі беларускім першы, букарашчліеўскі напеў, а другі, запісаны М. Чуркіным у паўночна-ўсходняй частцы Беларусі, як больш складаны рытмічна, прыпісвалі балгарам.

У раздзеле балгарскіх жніўных песень, а нярэдка і ў іншых старадаўніх народна-песенных жанрах я знайшоў яшчэ некалькі блізкіх па мелодыцы традыцыйнай беларускай песні балгарскіх напеваў.

Прыклады блізкіх песенных сувязей знайшоў я пазней і ў запісах іншых балгарскіх фалькларыстаў, асабліва ў вялікім зборніку В. Стоіна «Народныя песні ад Цімак да Віта» (1928 г.).

Але ўсё гэта былі кніжныя пошукі, падобныя на тое, калі батанік вывучае флору па засушаных лістах і кветках гербарыя.

З «жывой» балгарскай народнай песняй мне давялося сустрэцца толькі ў пяцідзесятыя гады: у час гастроляў у СССР вядомага творчага калектыву Народнай Балгарыі — Дзяржаўнага ансамбля песні і танца, а пазней — з выканаўцамі балгарскіх народных песень на конкурсах VI Сусветнага фестывалю ў Маскве. Непасрэдныя сустрэчы з выканаўцамі балгарскага песеннага фальклору пакінулі незабыўнае ўражанне. Нечым вельмі родным павявала ад многіх балгарскіх напеваў, блізкая і зразумелая была нам і манера выканання. Ды гэта і не дзіўна, бо як балгары, так і беларусы, у выніку многіх аб'ектыўных гістарычных прычын, захавалі старажытныя ўзоры традыцыйнага фальклору, што паспелі ўжо знікнуць з быту іншых народаў вялікай славянскай сям'і.

Член журы мастацкіх конкурсаў VI Сусветнага фестывалю моладзі, вядомы балгарскі кампазітар Ф. Куцеў таксама звярнуў увагу на блізкасць да балгарскага народнага меласу некаторых нашых песень, што выконваліся на конкурсе беларускім жаночым актэтам...

Балгарска-беларускія паралелі мы змаглі прасачыць і ў нотных прыкладах да цікавага даклада аб музычнай культуры банацкіх балгараў, які быў прачытаны летась на VII Міжнародным кангрэсе антрапалагічных і этнаграфічных навук у Маскве балгарскім музыказнаўцам С. Пятровым.

А вось што лісаў некалькі гадоў назад балгарскі музыказнаўца В. Крысцеў: «На вельмі плённыя думкі можа нас навесці параўнаўчае інтанацыйнае даследаванне стараславянскіх народна-песенных крыніц, якія, на шчасце, захаваліся ў нас і на тэрыторыі, якую ў мінулым займала старажытная Кіеўская і Маскоўская Русь». З гэтым нельга не пагадзіцца.

І ў нашы дні, у сучаснай песеннай творчасці нашых народаў, братнія сувязі праглядваюць не менш ясна, дзякуючы таму вялікаму і спрыяльнаму ўплыву, які зрабіла на развіццё песеннай творчасці балгараў і беларусаў у XX стагоддзі руская рэвалюцыйная і савецкая масавая песня, а таксама дзякуючы непасрэдным кантактам дзеячоў культуры нашых краін.

Народны ансамбль танца, хор, салісты Мінскага Дома культуры працоўных рэзерваў зараз рыхтуюцца да выступлення на Усесаюзным заключным канцэрце калектываў мастацкай самадзейнасці дзяржаўнай сістэмы прафесіянальна-тэхнічнага навучання. Канцэрт адбудзецца ў пачатку кастрычніка і будзе прысвечаны 25-годдзю працоўных рэзерваў.

Гэты здымак зроблены ў час рэпетыцыі юных танцораў.

ЧАТЫРЫ МЕСЯЦЫ ГАСТРОЛЯЎ

Амаль чатыры месяцы працягваліся гастролі Гомельскага абласнога рускага драматычнага тэатра. Яны праходзілі «ў сябе дома»: тэатр рабіў вялікую паездку па Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцях.

Больш двухсот разоў ішлі за гэты час спектаклі гамяльчан. Артысты наладжвалі таксама сустрачы з гледачамі, канцэрты, чыталі лекцыі. Так, група акцёраў у складзе Н. Карнеевай, М. Маліноўскага і заслужанага артыста БССР М. Цурбакова выступала з лекцыяй «Ленін у драматургіі».

У Гродна быў наладжаны дзіцячы шэфскі спектакль у фонд усенаўча, у адным з войсковых гарнізонаў — шэфскі спектакль для воінаў. Дзевяць артыстаў тэатра атрымалі ад падшэфных ганаровыя граматы. Магіляўчане ўручылі гасцям з Гомеля 21 дыплом, а рабочыя Мінскага аўтазавода — эмблему сваіх машын — зубра.

У многіх гарадах і пасёлках тэрмін гастроляў, па просьбе гледачоў, давялося працягваць. Так было ў Лідзе, Шчучыне, на шкловаводзе «Нёман» і Скідальскім цукровым заводзе, у санаторыі «Сасноўка», у гарадку Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Двойчы, у Мінску і Віцебску, тэатр выступаў па тэлебачанні.

Новы сезон гомельскія артысты пачнуць у канцы кастрычніка.

Л. САМСОНАЎ.

БАГАТЫЯ СКАРБЫ ЭТНОГРАФАЎ

Каля двух месяцаў працавала ў Беларусі экспедыцыя Дзяржаўнага музея этнаграфіі народаў СССР. Навуковыя супрацоўнікі збіралі матэрыялы да экспазіцый «Змены ў матэрыяльным і духоўным жыцці народаў за 50 гадоў Савецкай улады».

Каб вывучыць новае будаўніцтва на вёсцы, члены экспедыцыі па рэкамендацыі інстытута «Белгіпрасельбуд» выязджалі ў калгас імя Леніна Нясвіжскага раёна і ў саўгас «Волма» Мінскага раёна.

Вельмі цікавая ў этнаграфічных адносінах аказалася вёска Морач Нясвіжскага раёна. Сучаснае і старадаўняе адзенне, ювелірныя ўпрыгожанні, галаўныя ўборы, рэчы хатняга ўжытку жыхароў вёскі папоўняць беларускую калекцыю музея.

З сабою супрацоўнікі экспедыцыі ўзялі ўзоры ручнога ткацтва, разьбы па дрэву, пляцення і інкрустацыі саломкай. Сярод экспанатаў — цудоўныя па ўзору, строгія па колеравай гаме посцілкі, настольніцы, ручнікі.

Музейныя работнікі зацікавіліся такімі работамі беларускіх разбяроў, як «На базары», «Бадлівы казёл» і «Філін» В. Валкавога, «Цымбаліст» і «Лявоніха» П. Бусловіча, «Кукурузніца» В. Шостака, «Пакаранне ката» Л. Чубрыка, вырабамі з нарэльскай бярозы В. Ягела. Набыты сувенірны набор народнага посуду, які выпускае Барысаўская мастацкая фабрыка, рэчы з плеценай саломкі вытворчасці Жлобінскай фабрыкі мастацкай інкрустацыі.

Каля 120 розных вырабаў выпускаюць зараз мастацкія фабрыкі ў Івянцы і Барысаве. Многія з іх трапяць у музей.

Прыгожыя беларускія вырабы са шкла. Работнікі экспедыцыі павезлі з сабою ўзоры прадукцыі завода «Нёман», створаныя ў лепшых традыцыях народнага мастацтва.

Для музея адабраны вырабы з ільну і ільну з лаўсанам, якія выпускаюць прадпрыемствы Мінска.

Усяго экспедыцыяй набыта і атрымана ў падарунак каля 200 экспанатаў. Яны яскрава раскажуць шматлікім экскурсантам, турыстам, спецыялістам-этнографам, якія прыязджаюць у Ленінград, пра багацці Беларускай рэспублікі і майстэрства яе ўмельцаў.

Экспедыцыі наступных гадоў працягнуць вывучэнне быту і культуры беларускага народа, збор яго этнаграфічных скарбаў.

А. ФОЦІЯ,
навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага музея этнаграфіі народаў СССР.

ЗАДУМЫ, ЗДЗЯЙСНЕННІ

Савецкаму чытачу вядомы імёны балгарскіх пісьменнікаў, лаўрэатаў Дзімітраўскай прэміі Андрэя Гуляшкі і Эміла Каралава: кнігі іх неаднаразова выдаваліся ў нашай краіне. А над чым працуюць пісьменнікі цяпер? Вось што яны паведамілі.

Андрэй ГУЛЯШКІ:

Цяпер я працую над гістарычнай аповесцю «Залаты кубак». Яна перанясе чытача ў эпоху аднаго з магутнейшых балгарскіх цароў — ў эпоху Хана Крума. Я абраў гістарычную тэму дзеля таго, каб выказаць некаторыя сучасныя сцвярджэнні, каб закрануць некаторыя праблемы сучаснага жыцця...

Акрамя таго, працую над апошняй кнігай з цыкла прыгод Авакума Захава. У гэтай аповесці мой герой, Авакум Захаў, павінен сустрэцца з Джэймсам Бонсам, героем кнігі Яна Флемінга, якая выклікала вялікі шум на Захадзе. Джэймс Бонс — вульгарны ніцшэанец, наскрозь прасякнуты духам антыкамунізма. З гэтым аналагетам усяго антыкамуністычнага, амаральнага павінен сустрэцца разведчык - камуніст Авакум Захаў. Гэта будзе сустрэча дзвюх ідэалогій, двух светаў. Цяжкая сустрэча, але яна павінна адбыцца...

Эміл КАРАЛАЎ:

Заканчваю раман «Шумелі чынары», над якім працаваў амаль чатыры гады. Гэма сучасная: жыццё ў Балгарыі пасля красавіцкага пленума ЦК БКП, які аднавіў у нас ленінскія нормы партыйнага кіраўніцтва. Раман захоплівае падзеі ад 1961 да 1965 гадоў. У адным са старадаўніх нашых гарадоў разгортваецца вялікае сацыялістычнае індустрыяльнае будаўніцтва. Кіраўніцтва аднаго з заводаў не згаджаецца з артыкулам у мясцовай газеце... На прадпрыемства прыязджае камісія... Выторчыя ўзаемаадносіны герояў, іх жыццё і побыт раскрываюць высокія маральныя якасці нашай інтэлігенцыі і рабочага класа...

Я б назваў гэты твор раманам пра сумленне камуніста.

СУСТРЭЧА ПЕРШАЯ, РАДАСНАЯ

З эстрадным аркестрам Балгарскага радыё і тэлебачання я пазнаёміўся на яго першым канцэрце ў Палацы культуры Мінскага камвольнага камбіната, у дзень адкрыцця Дэкады балгарскай культуры ў Беларусі.

Гэты музычны калектыў яшчэ вельмі малады (існуе ўсяго толькі пяць гадоў), але ўжо дасягнуў вялікіх поспехаў. На VIII Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Хельсінкі ён стаў лаўрэатам конкурсу эстрадных аркестраў.

Узначальвае аркестр малады кампазітар Мілча Левіеў, выпускнік Сафійскай кансерваторыі. Левіеў—лаўрэат конкурсу кампазітараў на VII Сусветным фестывалі ў Вене, несумненна, таленавіты музыкант. У студэнцкія і першыя паслякансерваторскія гады ён пісаў камерныя творы; сёння ў цэнтры яго творчых інтарэсаў—эстрадная музыка: песні і аркестравыя п'есы. Яны былі прадстаўлены і ў справаздачным канцэрце. Хочацца адзначыць, у прыватнасці, вельмі добрую песню маладога кампазітара—«Сон»—своеасаблівы дуэт пеўчага голасу і саліруючай флейты. Прычым тут партыя флейты—інструмента зусім не спецыфічна джазавага—надзвычай цікавая і арыгінальная, напісана ўпаўне ў характары сучаснай эстраднай музыкі. Выконваўся таксама аркестравы блюз М. Левіева «У дзевяць»—п'еса, у якой аўтар шырока распрацоўвае рытмічныя формулы, тыповыя для балгарскай народнай музыкі.

Прыемнае ўражанне пакідае і Левіеў-дырыжор. Добры густ і пачуццё меры дазваляюць яму пазбегнуць наўмыснасці і вычварнасці паводзін, нярэдка ўласцівых джазавым дырыжорам. Левіеў малады і прывабны, яго «жыццё на сцэне» працякае вельмі натуральна, у добрым кантакце з аркестрам і з публікаю.

Удзельнікі аркестра, асабліва яго салісты-інструменталісты — музыканты высокай кваліфікацыі. Трубач Мішэл Немскі, саксафаністы Бечка Дэлчаў і Светазар Русінаў (яны ж іграюць на флейце і кларнеце), трамбаністы Ілія Ненаў і Міхран Бербяран, піяніст Вілі Казасян (ён—другі дырыжор аркестра і кампазітар, чые песні былі прадстаўлены ў праграме) віртуозна валодаюць сваімі інструментамі. Выкананыя імі шматлікія сольныя эпізоды прынеслі слухачам эстэтычную асалоду.

У аркестра вельмі высокая культура ансамблевай игры. Ен тучыць зладжана, рытм—востры і выразны, нюансы — экспрэсіўныя, але не крыклівыя.

Рэпертуар балгарскага аркестра разнастайны. У праграме, апрача твораў Левіева, — музыка іншых балгарскіх кампазітараў, эстрадныя песні і аркестравыя п'есы амерыканскіх, французскіх, нямецкіх і італьянскіх кампазітараў. Савецкая музыка была прадстаўлена ў канцэрце некалькімі песнямі А. Бабаджаняна.

Балгарская пеўчая школа дасягнула вялікіх поспехаў; балгарскія оперныя і канцэртныя спевакі заслужана карыстаюцца сусветнай славай. Хацелася б, каб і ў эстрадным жанры артысты ўмела спалучалі спецыфіку эстраднага спявання з высокай вакальнай культурай. Гэтага часам не хапала ў канцэрце, Марыя Міцева, Красіміра Мінева, Стэфан Воранаў і Кірыл Семаў імкнуцца да той манеры эстраднага спявання, якое культывуецца ў заходнееўрапейскіх краінах і вызначаецца італьянскім тэрмінам «урлаторы» («крыкуны»). І не ўсім з іх спадарожнічае поспех. Звышэкспрэсіўная манера спявання некаторых твораў эстраднай музыкі ўпаўне прыймальная. Але калі яна пераважае, дык становіцца назойлівай. Тут патрэбен вельмі высокі густ і абвостранае пачуццё меры—і ў самім спяванні, і ў артыстычных паводзінах на сцэне. І гэтага часам не хапала Красіміры Міневаі і зусім юнаму Стэфану Воранаву, хоць абодва яны несумненна таленавітыя.

Смех і весялосць панавалі ў зале ў час выступлення артыста Сафійскага «Маладзёжнага тэатра» Косты Цонева, які выканаў на рускай мове некалькі камічных сцэнак і народный. Мякка і натуральна, таксама на рускай мове, вёў канцэрт артыст гэтага ж тэатра Мілча Чарвенкаў.

Цікавая сустрэча з выканаўцамі балгарскага эстраднага мастацтва надоўга захаваецца ў памяці мінчан.

Л. АУЭРБАХ.

Салістка Красіміра Мінева з эстрадным аркестрам Балгарскага радыё і тэлебачання.

ЯКІМ ПАВІНЕН БЫЦЬ СЕЛЬСКІ КЛУБ?

Цікавую размову на гэтую тэму вядзе на сваіх старонках гомельская раённая газета «Маяк».

Работнікі Гомельскага раённага аддзела культуры падрабязна вывучылі становішча і перспектывы культмасавай работы ў вялікай вёсцы Пакалюбічы, цэнтры эканамічна моцнага калгаса імя Леніна. У кожным доме калгасніка ёсць прыёмнік або тэлевізар. На 729 двароў выпісваецца 1889 экземпляраў газет і часопісаў. Але клубная работа там вядзецца па старынцы.

Вось некалькі пытанняў і адказаў з распаўсюджанай у Пакалюбічах анкеты (яе запоўніла 114 чалавек).

— Дзе і як вы праводзіце вольны час?

— Дома, за чытаннем або ля тэлевізара,—адказала большасць калгаснікаў.

— Ці часта вы бываеце ў клубе?

— Рэдка або вельмі рэдка,—адказалі 72 чалавекі.

Толькі 12 чалавек напісалі: «У клубе бываем часта».

Значыць, 80 працэнтаў з тых, хто запоўніў анкеты, зусім не наведваюць клуб або ходзяць туды вельмі рэдка. Тлумачыцца гэта тым, што ў клубе, акрамя танцаў, амаль нічога не бывае. А між іншым большасць жыхароў вёскі — людзі сярэдняга і пажылога ўзросту.

Клуб і бібліятэка слаба памагаюць калгасу ў выкананні гаспадарчых задач.

Многія выказалі жаданне памагчы клубу ліквідаваць недахопы ў рабоце, удзельнічаць у самадзейнасці. Бібліятэкар школы А. Сайкоў прапанаваў аформіць стэнды, слесар Д. Хузееў паабяцаў памагчы сачыць за грамадскім парадкам у клубе.

Дыспут «Якім павінен быць сельскі клуб?» (у ім удзельнічала 60 чалавек), праведзены па выніках абследавання ў Яромінскім калгасным Доме культуры, прайшоў цікава і ажыўлена. Працяг яго—серыя артыкулаў у раённай газеце, у якіх асвятляюцца першачарговыя праблемы ўздыму сельскай культуры.

Важнае пытанне закрануў у сваім артыкуле «Хата прыгожая кутамі» старшыня калгаса імя Урыцкага А. Паташкін. На прыкладзе сваёй гаспадаркі ён паказвае, як патрэбна дапамога праўлення калгаса сельскаму асяродку культуры — незалежна ад таго, у чыім падпарадкаванні ён фармальна знаходзіцца. «Установа культуры павінна вабіць і «кутамі», гэта значыць прыемным вонкавым і ўнутраным выглядам, утульнасцю, прыгажосцю. Дзеля таго каб гэта ўсюды стала рэальнасцю, нельга шкадаваць намаганняў», — піша аўтар артыкула.

Ніводзін бок дзейнасці сельскага клуба не пакінулі без увагі ўдзельнікі размовы. «Вечар пачынаецца з афішы» —на канкрэтных прыкладах вядзе гаворку аб гэтым загадчыца кабінета палітасветы райкома КПБ Н. Драбышэўская. Загадчык Чкалаўскага сельскага клуба І. Хаяраў расказвае ў артыкуле «Каб песня клікала на добрыя справы» пра энтузіястаў мастацкай самадзейнасці, пра тую дапамогу, якую чакаюць яны ад раённага аддзела культуры і абласнога Дома народнай творчасці. Агітбрыгадам патрэбны сцэнарыі, патрэбны кваліфікаваныя кіраўнікі. Перыядычна трэба праводзіць агляды. «Агітбрыгады могуць аказаць вялікую дапамогу партыйным арганізацыям у барацьбе за ўсталяванне прынцыпаў камуністычнай маралі. На мой погляд, усе культработнікі павінны ўдзяляць значна больш увагі гэтаму пытанню», — піша І. Хаяраў.

«Другая прафесія настаўніцы Баранавай» —расказ пра Марыю Аляксандраўну Баранаву і яе таварышаў, актывістаў сельскай культуры. «Два гады назад у раёне ўзнік высакародны рух—шэфства сельскай інтэлігенцыі над культурна-асветнымі ўстановамі. Але прайшоў час, і ў многіх месцах гэта справа заглухла. У радзе вёсак інтэлігенцыя зусім не ўдзельнічае ў рабоце культустаноў. Лічу, што трэба зноў звярнуцца да гэтага пытання»,— гаворыць аўтар карэспандэнцыі загадчык Заліпскай сельскай бібліятэкі І. Пічукоў.

Адным з цікавых у дыскусіі з'яўляецца артыкул намесніка загадчыка раённага аддзела культуры А. Станкевіча «Два працэнты. Многа гэта ці мала?» — пра сродкі культфонду калгасаў і іх выкарыстанне.

Праўленне калгаса імя XXII з'езда КПСС, піша А. Станкевіч, не шкадуе сродкаў на культурныя патрэбы. Летась у культфонд было адлічана звыш 18 тысяч рублёў. За год на культурна-бытавыя патрэбы выдаткавана больш запланаванай сумы — 20.242 рублі.

Старшыня калгаса М. Хаванскі сочыць за тым, каб гэтыя сродкі выкарыстоўваліся па прызначэнню. Калгас абсталяваў Палац шчасця, дзе адбываюцца ўрачыстыя рэгістрацыі шлюбаў па новых абрадах. Для дзяцей калгаснікаў пабудаваны піянерскі лагер у Чонках. Каля пяці тысяч рублёў пайшло на аплату кіраўнікам мастацкай самадзейнасці і афармленне наглядной агітацыяй клуба і тэрыторыі калгаса. Наладжваліся калектыўныя паходы ў тэатры, ставіліся сельскагаспадарчыя фільмы.

А вось у суседзяў—у калгасе «Перамога» — зусім іншы малюнак. Гэта таксама перадавая гаспадарка, і людзі там зарабляюць не менш. Аднак многія юнакі і дзяўчаты пры зручным выпадку ўладкоўваюцца на працу ў горадзе. Прычына — недастатковыя клопаты калгаса пра быт хлебаробаў, пра арганізацыю культурнага адпачынку.

Брыгадныя клубы калгаса маюць непрывабны выгляд. У іх не створаны элементарныя ўмовы для адпачынку хлебаробаў. Пабудавалі клуб у вёсцы Асаўцы, але ў ім няма крэслаў, ніякага культінвентару.

Падобныя факты, на жаль, маюць месца не ў адным калгасе «Перамога», піша А. Станкевіч. У многіх калгасах у культфонд адлічваецца менш грошай, чым трэба. Але нават і гэтыя сродкі часта выкарыстоўваюцца не па прызначэнню.

Вельмі слушны вывад робіць аўтар артыкула, калі гаворыць: «Якімі б сталі нашы клубы, калі б да бюджэтных асігнаванняў дадаць яшчэ сродкі культфондаў калгасаў!

Два працэнты ад прыбытку калгасаў раёна летась павінны былі скласці каля 140 тысяч рублёў. Давайце прыкінем, што можна зрабіць за гэтыя грошы.

Утрыманне кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці ва ўсіх клубах раёна, пры сярэднемесячнай зарплаце кіраўніка ў 60 рублёў, складзе 28 тысяч рублёў. Каб ва ўсіх клубах былі баяны, трэба выдаткаваць 1.700 рублёў. Замяніць ва ўсіх культасветустановах лаўкі на крэслы — 10 тысяч рублёў. Для павелічэння кніжнага фонду на тысячу экземпляраў у кожнай бібліятэцы патрэбна прыблізна 28 тысяч рублёў.

Цяпер падвядзём вынікі. Усе выдаткі не складуць і 50 працэнтаў сумы, што калгасы павінны былі сёлета адлічыць у культфонд. Вось што азначаюць „два працэнты! Калі ў нас будуць іх выкарыстоўваць па прызначэнню, то за год-два можна карэнным чынам змяніць аблічча культасветустаноў».

Патрэбную размову вядзе на сваіх старонках газета «Маяк». Калі ўсе прапановы, што выказаны ў гэтай дыскусіі, будуць ажыццёўлены, установы культуры Гомельскага раёна будуць працаваць намнога лепш і цікавей.

НЕ ПРОСТА СУПАДЗЕННЕ

Першая перадача балгарскага тэлебачання адбылася 7 лістапада 1959 года. Не выпадкова дзень нараджэння нашага тэлебачання супаў з днём нараджэння найсправядлівейшага ладу на зямлі—сацыялістычнага. Гэтае супадзенне не проста звычайны каляндарны факт, а верны арыенцір для ідэйна-мастацкай дзейнасці балгарскага тэлебачання, творчы компас для яго супрацоўнікаў. Уся работа балгарскага тэлебачання, самага маладога тэлебачання ў Еўропе, падкрэслівае гэтую думку.

Многія творчыя супрацоўніні балгарскага тэлебачання атрымалі сваю кваліфікацыю ў Маскве. Так паступова было створана ядро піянераў, якія паклалі аснову ўсім творчым звенням ў тады яшчэ вельмі бедным на кваліфікаваныя кадры нашым тэлебачанні. Пазней яны сталі перадаваць свой вопыт многім рэдактарам, рэжысёрам і аператарам. Савецкае тэлебачанне вельмі многа дапамагло свайму малодшаму брату.

Мастацкія дзеячы на нашым тэлебачанні стварылі многа перадач, якія расказваюць пра жыццё савецкіх людзей, пра іх культуру, якія раскрываюць іх міралюбнасць і высакароднасць, іх імкненне да міру, Нашы перадачы расказваюць пра велічныя будоўлі Савецкай краіны, пра магутнасць СССР. Гэтыя тэмы і сюжэты былі вельмі цікава раскрыты і ў тэлевізійных навінах, і ў фільмавых навелах, і ў лаканічных дакументальных фільмах, шматлікіх рэпартажах, інтэрв'ю і г. д. Спецыяльная серыя перадач «Ці ведаеце вы Савецкі Саюз» была сустрэта з вялікай цікавасцю гледачамі. Пераможцы ў гэтым тэлевізійным спаборніцтве мелі шчасце наведаць Маскву і Ленінград і ўбачылі сваімі вачыма тое, пра што іх з такой строгасцю экзаменавалі перад тэлевізійнай камерай. Уроні рускай мовы, арганізаваныя нашым тэлебачаннем, хутка набылі папулярнасць сярод мільённай аўдыторыі гледачоў.

У кожную пятніцу мы трансліруем перадачы Маскоўскага тэлебачання. Гэтыя пятніцы ператвараюцца ў своеасаблівыя святы для нашых тэлегледачоў, таму што на працягу некалькіх гадзін у іх ёсць магчымасць непасрэдна знаёміцца з дасягненнямі савецкай культуры. Творчы абмен паміж нашым і Маскоўскім тэлебачаннем мае вялікую каштоўнасць таму, што гэта непасрэдны кантакт паміж двума братэрскімі народамі, двума братэрскімі культурамі.

Любен ПАПОЎ,
балгарскі журналіст.

У МАЙСТЭРНЯХ МАСТАКОЎ

Фёдар Дарашэвіч за работай.

НА АДНОЙ з пасляваенных рэспубліканскіх выставак выяўленчага мастацтва ў Мінску ўвагу гледачоў прыцягвала палатно, сюжэт і жывапісны лад якога, на першы погляд, не вызначаліся арыгінальнасцю. А гледачы падоўгу прастойвалі перад гэтым палатном.

Што іх захапляла?

Звычайная сцэнка сялянскай працы: калгаснікі з дапамогаю цягача збіраюць з поля каменне. Проста і сціпла. Палатно так і называлася—«Ачыстка палёў ад камення». Пад ім стаяў подпіс Фёдара Іванавіча Дарашэвіча.

У будзённым, малазначным, на першы погляд, факце Фёдар Дарашэвіч шукае вялікага зместу.

..На парозе вялікай светлай мансарды мяне сустракае немалады ўжо, трохі стомлены працаю, але вельмі энергічны чалавек. Усяляк ухіляецца ад гаворкі пра сваю творчасць—гэтага ён не любіць. На просьбу маю падзяліцца творчымі планамі адказвае коратка:

— Я люблю пісаць пейзаж. Не «чысты» пейзаж, а з людзьмі... Не ўяўляю сабе зямлі, не населенай, не асвоенай людзьмі...

Уся творчасць мастака, усе яго шматлікія пейзажы і карціны пераканаўча сведчаць пра гэта.

Вечна малады пульс нашага жыцця Фёдар Дарашэвіч вучыўся адлюстроўваць яшчэ ў дваццатыя гады, калі нейкі час працаваў мастаком-афарміцелем. Ад часоў навучання ў трыццатыя гады ў Ленінградскім інстытуце імя Рэпіна па класу прафесара Асьмёркіна і да сённяшняга дня вялікую ўвагу аддае ён прафесіянальным праблемам — такім, як каларыт, гармонія колеру і формы. Жывапіс класікаў вывучае заўсёды з захапленнем. Гэта было відаць яшчэ ў дыпломнай яго рабоце «Вяртанне з манеўраў».

Ураджэнец Брэстчыны, Фёдар Дарашэвіч у гады Вялікай Айчыннай вайны актыўна ўдзельнічае на Урале ў агітацыйна-прапагандысцкай рабоце, стварае агітплакаты і пано, апявае ў жывапісных палотнах веліч уральскай прыроды.

1950 год — хвалюючы год вяртання мастака ў Беларусь. Пачынаецца новы перыяд яго творчасці. Пейзажы роднай прыроды, партрэты прапаўнікоў калгасных палёў і заводскіх цэхаў—усё гэта ставіць перад ім новыя і новыя каларыстычныя і кампазіцыйныя задачы, якія не так проста ўдаецца вырашаць.

Услаўляючы мірную працу савецкіх людзей, Фёдар Дарашэвіч не забывае і тэму абароны Радзімы. Ен многа ездзіць, бывае ў пагранічнікаў Брэстчыны, на карэблях Балтыйскага флоту. Вынік гэтых паездак—карціны «Пошта прыйшла», «Трывога», «У лётны дзень». Усё гэта—насычаныя пачуццём творы, у якіх лейтматывам праходзіць тэма ўзаемаадносін чалавека і прыроды. Ад палатна да палатна ўдасканальваецца кампазіцыйнае майстэрства мастака.

У 1964 годзе—на рэспубліканскай мастацкай выстаўцы «На варце міру»—Фёдар Дарашэвіч выстаўляе палатно, прысвечанае абаронцам Брэсцкай цытадэлі,—«Страляйце! Не шкадуйце нас!.» Абраўшы для карціны просты сюжэт, мастак здолеў вырашыць яго арыгінальна, па-свойму. Тэма гераізму савецкага чалавека прагучала ў гэтым палатне на поўную сілу.

Задача мастака ўскладнялася тым, што ў абраным кампазіцыйным вырашэнні фігуры медыцынскіх сясцёр і ворагаў, якія ідуць у атаку, хаваючыся за спінамі палонных, апынуліся амаль у адной плоскасці—на першым плане карціны. Аднак Фёдар Дарашэвіч справіўся са сваёй задачай, удала прымяніўшы прыём колернага кантрасту.

На мой погляд, гэта лепшая з карцін Фёдара Дарашэвіча. У ёй пераканальна характарызуюцца асноўныя персанажы. Палатно ўражвае, глыбока закранае пачуцці гледача.

Творчасць Фёдара Дарашэвіча вядома далёка за межамі Беларусі. Наведвальнікі ўсесаюзных выставак выяўленчага мастацтва ў Маскве мелі магчымасць пазнаёміцца з такімі яго работамі, як «Плыты на рацэ Каме», «Газаправод» і іншыя.

Знаёмячыся на выстаўках і ў майстэрні мастака са значнай часткай таго, што стварыў ён на працягу не аднаго дзесятка год напружанай творчай працы, не магу не падкрэсліць яго невычарпальную любоў да працы. Эцюды, эскізы, малюнкі—сотнямі. І, апроч таго, вялікая праца па выхаванню творчай моладзі—Фёдар Іванавіч выкладае ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце.

І пры ўсім гэтым ён не стамляецца шмат падарожнічаць па роднаму краю. Вось і цяпер у выніку падарожжаў на станку ў майстэрні — новая карціна «Мазыр».

...Панарама старажытнага, але па-сённяшняму маладога беларускага горада. Многа і напружана працуе мастак над кампазіцыяй палатна, дамагаючыся дасканалага эмацыянальнага ладу пейзажа-карціны. Многае ўжо ўдалося яму. Яркі сонечны дзень, дух абнаўлення, уласцівы пасляваеннаму Мазыру, пераканальна перададзены стан прыроды... Даецца ўсё гэта мастаку нялёгка. Пра гэта сведчаць варыянты кампазіцыі, у якіх падкрэслены зусім іншыя рысы абраздга матыву...

На мальберце ў майстэрні—вялікае нескончанае палатно «Пхоў. Рачны порт». Гэтую карціну мастак маркуе скончыць да адной з бліжэйшых рэспубліканскіх выставак.

Мастак падышоў у прыгаданых тут двух палотнах да вялікага, панарамнага ахопу пейзажу. Ен імкнецца сінтэзаваць свае ўражанні, паказаць у пейзажах істотнае, тыповае для той ці іншай мясцовасці, падкрэсліць індустрыяльную магутнасць рэспублікі.

Каларыт апошніх пейзажаў Фёдара Дарашэвіча шмат у чым адрозніваецца ад той серабрыста-шэрай гамы, якая доўгі час была традыцыйнай для яго жывапісу. Але самае галоўнае, на мой погляд, у тым, што ў гэтых палотнах мастаку ўдалося пазбегнуць залішняй, падчас надта сумнай для гледача дробнасці ў кампазіцыі і ў жывапіснай манеры.

Есць у Фёдара Дарашэвіча планы, звязаныя з падрыхтоўкай да выставак выяўленчага мастацтва ў гонар слаўнага 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. Ствараюцца эскізы новых кампазіцый. Але пра іх мастак пакуль што не гаворыць.

Пакідаючы майстэрню Фёдара Дарашэвіча, прыгадваючы ўсё, што давялося там убачыць, я думаю пра яго невычарпальную энергію, пра нескончаную маладосць таленту. І хочацца яшчэ раз сказаць: самае істотнае ў яго характары мастака і чалавека—гэта улюбёнасць у жыццё.

Леанід ДРОБАЎ.

ЗА ПРЫВАТНЫМ ФАКТАМ — ВАЖНАЯ ПРАБЛЕМА

А ГЭТА Ж БЫЛІ ЛЕПШЫЯ

СЁЛЕТА, не першы ўжо раз, давялося мне прымаць уступныя экзамены па беларускай мове і літаратуры на філалагічны факультэт БДУ імя Ул. І. Леніна. Узрадавала тое, што конкурс, у параўнанні з мінулым годам, вырас. Значыцца, вырасла цяга выпускнікоў сярэдніх школ да літаратуры. Але, як ніколі раней, было ў часе экзаменаў і таго, што на маю думку, патрабуе неадкладнай гаворкі і абмеркавання.

Перш за ўсё аб ведах па літаратуры, па праграмным для школы матэрыяле. Гэтыя веды (а я іх магу параўноўваць з тым, як ведалі праграмы матэрыял абітурыенты ранейшых гадоў, пачынаючы з 1955 года) пагоршыліся. І справа, думаецца, не толькі ў тым, што цяпер у сярэдняй школе больш скарочаная праграма па літаратуры. Абітурыенты часта не ведаюць творчасці і жыццёвага шляху менавіта «праграмных» пісьменнікаў. Яшчэ горш у іх з веданнем асноўных этапаў развіцця роднай літаратуры, пытанняў тэорыі літаратуры і эстэтычнага аналізу.

Раней, напрыклад, былі вельмі рэдкія выпадкі, калі паступаючыя не ведалі пастаноў ЦК партыі па ідэалагічных пытаннях. Сёлета ж многія абітурыенты іх не ведалі, асабліва пастаноў 1925 і 1932 гадоў. Не ведалі, напрыклад, выпускнікі Вялікапольскай школы Чэрвеньскага раёна, Равяніцкай СШ Брэсцкай вобласці і інш. У выніку абітурыенты не маглі разабрацца ў заканамернасцях развіцця роднай літаратуры ў 20-я і 30-я гады. Многія з іх не маглі нічога сказаць і пра асноўныя этапы развіцця беларускай літаратуры ў апошняе дваццацігоддзе.

Асабліва прыкрае ўражанне засталося ад таго, што выпускнікі сярэдніх школ часам мысляць аб літаратуры вельмі схематычна. У іх адказах усё яшчэ моцна дае сябе адчуць сацыялагізатарскі падыход да літаратуры (творы разглядаюцца імі толькі як ілюстрацыі да гісторыі, да сацыяльна-эканамічнага жыцця народа). Ці пра творчасць Дуніна-Марцінкевіча, Багушэвіча, ці пра дарэвалюцыйную творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа — многія абітурыенты гаварылі адно і тое ж: «паказвалі цяжкое жыццё народа». І гэта безадносна, ці гутарка ідзе аб часе прыгону, ці аб часе трох рускіх рэвалюцый, калі ўжо грымелі рэвалюцыйныя вершы Купалы і Коласа. Уся савецкая літаратура ў такога выпускніка — паказ не цяжкога, а радаснага жыцця. Не дзіўна, што той-сёй лемантуе «Рэжуць!», калі яго спытаеш, а што радаснага было ў жыцці Міхала Тварыцкага... У палоне схематызму дзе ўжо тут да разумення праблематыкі, чалавеказнаўчага зместу характараў, створаных пісьменнікам, альбо творчай індывідуальнасці таго ці іншага літаратара!

Тут, мне здаецца, усе прэтэнзіі да настаўнікаў. Не навучыць вучняў вызначаць тэму і ідэю твора — гэта значыць не даць ім самага элементарнага. А іменна ж гэтага элементарнага не мелі выпускнікі Навадворскай школы Мінскага раёна, Раеўскай школы Маладзечанскага раёна і многія іншыя.

Дрэнна, што не ўсе настаўнікі ўмеюць прывіваць вучням любоў да слова, не ўсе вучаць адчуваць яго выразнасць, дакладнасць, маляўнічасць, эмацыянальнасць. Гэта відаць было як на пісьмовым, так і на вусным экзамене. Мне могуць запярэчыць, што праграмай не прадугледжана вывучэнне ўсяго гэтага. Але ж у праграме ёсць пункты, якія абавязваюць настаўнікаў раскрываць вучням сілу, энергію слова, яго вобразна-выяўленчыя мажлівасці. Я маю на ўвазе вывучэнне прыказак, метафар, эпітэтаў і г. д. І тут важна, каб вучань не проста запомніў тэарэтычныя азначэнні, а каб ён навучыўся адчуваць дзейсную сілу слова, каб ён напаўняў тропамі сваю мову, любіў слова яркае, каларытнае, дасціпнае, вострае.

Больш увагі трэба аддаваць у школе і тлумачэнню, што такое пародыя, сатыра, іронія. Разуменне падобных тэрмінаў патрэбна не толькі літаратару, — і тым больш крыўдна, што яго не маюць тыя, хто збіраецца ім стаць.

Але ўсё ж самае «слабое» месца ва ўчарашніх школьнікаў — гэта беднае знаёмства іх з сучаснай літаратурай, з лепшымі творамі сённяшняй прозы і паэзіі. З адказаў абітурыентаў, напрыклад, было бачна, што амаль ва ўсіх сельскіх школах вучні не маюць магчымасці чытаць «Полымя», «Маладосць», «Літаратуру і мастацтва», бо там іх не выпісваюць. Тут, відаць, віна і настаўнікаў, і бібліятэкараў. З таго, што чыталі абітурыенты, я зрабіў вывад, што школьныя бібліятэкі зусім не ўкамплектаваны творамі сучаснай літаратуры. Таму паступаючыя ведаюць назубок падручнік, а назваць навінкі альбо якія-небудзь факты з сённяшняга літаратурнага жыцця рэспублікі не могуць.

Некалькі слоў аб пісьмовым экзамене. Абітурыентам былі прапанаваны тры тэмы: дзве — літаратурныя, адна — вольная. Сёлета назіраўся прыкметны зрух абітурыентаў у бок самастойнага, творчага вырашэння тэмы: сачыненне на вольную тэму пісала каля сарака працэнтаў паступаючых. На жаль, у многіх сачыненнях на літаратурную тэму ўсё яшчэ панаваў шаблон, механічна завучаныя фразы з падручніка, скаванасць думкі і слова. На маю думку, час зусім адмовіцца на пісьмовым экзамене ад сачыненняў на літаратурныя тэмы, а прапаноўваць тэмы вольныя, якія даюць сапраўды шырокія мажлівасці абітурыенту паказаць свае здаткі, схільнасці да літаратуры. Веданне ж праграмнага матэрыялу па літаратуры можна лёгка высветліць на вусным экзамене.

Вядома, нямала абітурыентаў паказалі на ўступных экзаменах добрыя веды па літаратуры. У прыватнасці, паспяхова здавалі як вусны, так і пісьмовы экзамен выпускнікі Зельвенскай школы Ваўкавыскага раёна, Валожынскай сярэдняй школы № 1, Дзярэчынскай СШ Мастоўскага раёна і інш. І ўсё ж трывога за стан выкладання літаратуры ў школе не беспадстаўная. Тыя некалькі соцень абітурыентаў, што паступалі на філфак, былі, трэба думаць, лепшымі, самымі моцнымі па літаратуры выпускнікамі школ рэспублікі. І калі веды іх былі ў большасці яўна недастатковыя, то што ж тады можна думаць аб ведах іх аднакласнікаў, якія абралі біяфак, фізфак, матфак?

Вядома, вызначыць, у чым прычына прабелаў у выкладанні роднай літаратуры ў школе, мне, як выкладчыку ВНУ і чалавеку, які непасрэдна не звязаны са школай, цяжкавата. Хочацца, каб пра гэта павялі гаворку самі настаўнікі. Але не магу не выказаць некалькі меркаванняў і заўваг.

Знаёмства з падручнікамі для сярэдняй школы пераконвае ў тым, што варта было б зрабіць іх больш аб'ёмнымі. Няхай бы не ўсе старонкі з падручніка залаваў вучыць настаўнік вучням, няхай бы там было больш мясцін, набраных петытам (іх, я веру, прачыталі б тыя вучні, якіх цягне да літаратуры), і няхай бы — гэта галоўнае — былі ў падручніках шырока разгорнутыя раздзелы аб этапах развіцця беларускай савецкай літаратуры, аб літаратуры на сучасным этапе. Вельмі патрэбна цяпер школе і хрэстаматыя па беларускай літаратуры, аб чым слушна пісалі настаўнікі на старонках газеты «Літаратура і мастацтва». Асабліва патрэбна хрэстаматыя па сучаснай беларускай літаратуры.

Мне здаецца таксама, што настаўнікі павінны былі даўно ўжо ўшчаць гаворку аб гадзінах, якія адпушчаны цяпер на вывучэнне літаратуры. Гадзін гэтых смехатворна мала: у старэйшых класах — адна-дзве на тыдзень. Паспрабуй за такі час даць вучням і аглядныя ўрокі па перыядах, і расказаць аб жыццёвым і творчым шляху пісьменнікаў, і навучыць вучняў як след разумець літаратуру, адчуваць яе сілу і прыгажосць, і пазнаёміць з навінкамі. Думаю, што над гэтым пытаннем павінны ўсур'ёз падумаць і таварышы з Міністэрства асветы рэспублікі.

Што такое літаратура, якая яе роля ў фарміраванні чалавечага характару, савецкага патрыятызму і гуманізму, гаварыць, бадай, не трэба. Кожны гэта ведае. Тым больш прыкра, што, на маю думку, у школе цяпер склалася пагрозлівае становішча з выкладаннем літаратуры. Яна пры такім стаўленні да яе не можа выконваць сваіх функцый інжынера чалавечых душ, не мае шырокіх магчымасцей выхоўваць усебакова развітага чалавека — будаўніка камунізма. Прычына гэтага становішча, паўтараю, у тым, што вельмі мала гадзін аддае сёння школа літаратуры — спрадвечнаму сейбіту «добрага, разумнага, вечнага». Патрэбна неадкладнае павелічэнне гадзін на выкладанне літаратуры, патрэбна больш грунтоўна і разумна камплектаваць школьныя бібліятэкі творамі сучаснай літаратуры, патрэбна актывізаваць настаўнікаў на выкараненне тых прабелаў, якія яны дапускаюць у сваёй рабоце.

І апошняе. Сёлетні экзамен яшчэ раз пераканаў мяне ў адной з даўніх маіх думак. Ходзіць, ведаеце, такая беспадстаўная легенда, быццам на філфак можа вучыцца любы. Каб паступіць туды, ніякіх, маўляў, схільнасцей не трэба: прачытаць раман і пераказаць яго, запомніць біяграфію пісьменніка — хто гэтага не зможа? І вось прыходзяць такія людзі на філфак. Яны добрасумленна прачыталі праграмны матэрыял, вывучылі біяграфіі, ведаюць мову. І яны нярэдка паступаюць на філфак. А потым... Я ведаю дзесятак чалавек, якія скончылі філфак, але філолагамі не сталі. Чаму? Ды проста літаратура не была для іх чымсьці адзіна жыццёва неабходным, не было ў іх схільнасцей, прыродных задаткаў да яе.

Даўно ўжо стала традыцыяй, што матэматыкі, фізікі, хімікі праводзяць алімпіяды, развіваючы ў вучняў цікавасць да «сваіх» прадметаў, выяўляючы ў іх пэўныя здольнасці. І вельмі часта менавіта гэтыя вучні становяцца студэнтамі-матэматыкамі, фізікамі і г. д. Мне думаецца, што пара ўжо і філолагам праводзіць свае алімпіяды, абуджаючы ў вучняў цягу да вывучэння літаратуры і мовы, выяўляючы ў іх адпаведныя схільнасці. Гэта, мне здаецца, дапамагло б адбіраць у ВНУ людзей невыпадковых, і яшчэ задоўга да экзаменаў паказала б вучню, ці ягонае гэта прызванне — філалагічны факультэт.

Алег ЛОЙКА,
дацэнт кафедры беларускай літаратуры БДУ імя Ул. І. Леніна.

У першы дзень новага навучальнага года ў Мінскім радыётэхнічным інстытуце пачаў працаваць кніжны кіёск. У кіёску вялікі выбар не толькі вучэбнай, але і мастацкай літаратуры. Кіяскёр Ул. Багачух пачынае свой працоўны год.

Фота Ул. КРУКА.

ВОБРАЗ ПРАВАДЫРА НАТХНЯЕ

Мнагалюдна было ў гэты вечар у Тураўскім Доме культуры. Калгаснікі сельгасарцелі «Новае жыццё» Жыткавіцкага раёна прыйшлі на тэматычны вечар «Будуй жыццё па Леніну».

У памяшканні клуба была афармлена кніжная вітрына пра жыццё і рэвалюцыйную дзейнасць Ул. І. Леніна і бібліятэчны плакат на тэму «Вобраз Ул. І. Леніна ў мастацкай літаратуры».

На вечары выступілі сакратар партыйнай арганізацыі калгаса М. Ісаева, старшыня калгаса М. Бялко, брыгадзір трактарнай брыгады Герой Сацыялістычнай Працы М. Рудзянка, заатэхнік А. Каламейчук, калгаснікі А. Бароіч, М. Румас.

Удзельнікі тэматычнага вечара з вялікай цікавасцю праслухалі запісаную на плёнку прамову Ул. І. Леніна «Што такое Савецкая ўлада» і паглядзелі дакументальны фільм пра жыццё і дзейнасць правадыра працоўных.

Я. АЛЬБЕРСОН.

ЦІ АПРАЎДВАЮЦЦА НАДЗЕІ?

Некалькі дзён назад я быў у Рагачове, цікавіўся работай кнігагандлю. Тут дзве кнігарні, дакладней — кніжны аддзел раймага і спецыялізаваны магазін (таксама сістэмы спажыўкааперацыі). Наведаў я абедзве.

«Заказваеце літаратуру па тэматычных планах? Напрыклад, па плане выдавецтва «Беларусь»?»— пацікавіўся я ў кніжным аддзеле раймага. «Не, — адказалі мне. — Наш таваразнаўца па кнізе сказаў, што гэта яго справа». «Але ж пакупнік ідзе не на базу райсаюза, а ў магазін, да вас!» — выказаў я здзіўленне. «Безумоўна, — згадзілася са мною прадавец Берта Маркаўна Шварцман, вопытны ў сваёй справе чалавек. — Раней план знаходзіўся ў магазіне, мы знаёмілі з ім сваіх кліентаў, раіліся з імі. А цяпер...»

Гутару з прадаўцамі кніжнага магазіна, якім загадвае Н. Надзько. Яна прызнаецца, што ў кнігагандлі працуе нядаўна, не ўсё яшчэ ёй знаёма і зразумела. Цікавіўся, як ідзе збор заказаў. Надзея Захараўна не разумее мяне. «Ну, збор і афармленне заказаў па тэматычным плане», — тлумачу я і бачу, што маладая загадчыца нават уяўлення не мае пра гэты самы план. Яна і прызнаецца шчыра: «Сапраўды, не ведаю, што гэта такое. Заказы, відаць, афармляе наш таваразнаўца па кнізе, Сталярова...».

Званю на базу райсаюза. Сталяровай няма, яна ў адпачынку. Пытаюся ў загадчыка гандлёвага аддзела А. Мяжэннага, ці не ведае ён што-небудзь пра лёс заказаў. Мяжэнны дакладна не ведае, адказвае, што тэматычныя планы ў іх ёсць і, як толькі вернецца таваразнаўца, заказы будуць афармлены...

Усё гэта было для мяне дзіўнай нечаканасцю. У традыцыйнай «памятцы», якой адкрываецца тэматычны план выдавецтва «Беларусь» на 1966 год (пра гэты план і будзе ісці гутарка), Упраўленне кніжнага гандлю Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку, Белкаапсаюз і выдавецтва звяртаюцца да дырэктараў аблкнігагандлю і аблспажыўсаюзаў з просьбай пазнаёміць з планам «работнікаў кніжнага гандлю, бібліятэк, прадпрыемстваў, навучальных устаноў, навуковых і грамадскіх арганізацый, а таксама пакупнікоў і арганізаваць збор заказаў на гэтае выданне», каб «вызначыць заказ па кожным выданні ў колькасці, якая поўнасцю задавальняе сапраўдныя патрэбы насельніцтва ў літаратуры». «Памятка» сведчыць, што на тэматычны план выпуску літаратуры ўскладаюцца вялікія надзеі. І раптам — плана няма ў магазіне, загадчык не мае аб ім ніякага ўяўлення. Было ясна, што тут не магла ісці і гутарка аб якім-небудзь «азнаямленні», тым больш — аб папярэднім зборы заказаў, аб вызначэнні «сапраўдных патрэб насельніцтва ў літаратуры».

У чым жа справа? — узнікала само сабою пытанне. У выпадковасці, у тым, што таваразнаўца па кнізе ў водпуску, а работнікі кніжнага магазіна яшчэ малавопытныя? Ці ў нечым іншым, больш характэрным? Прыгадваўся тут жа і яшчэ адзін падобны факт, пра які паведамляў у газету «Літаратура і мастацтва» чытач са Слуцка. Ён зайшоў у галаўны кніжны магазін і не знайшоў там тэматычнага плана выдавецтва «Беларусь». Некаторыя іншыя планы былі, а гэтага не аказалася. Значыць, справа, відаць, не ў выпадковасці. Прынамсі, тыя надзеі, якія звязваюць з тэматычным планам, не зусім апраўдваюцца. Але ў якой меры яны апраўдваюцца і не апраўдваюцца? Якую ўсё ж ролю адыгрывае план у прапагандзе і рэалізацыі той кніжнай прадукцыі, якая неўзабаве паступіць у магазіны?

У пошуках адказу на гэтыя пытанні я звяртаюся ў кніжныя магазіны Мінска. У адзін, другі, трэці... Доўга гутару з загадчыкам магазіна № 4 Аляксандрам Паўлавічам Зарыцкім—цікавым, ініцыятыўным у сваёй справе чалавекам. У іншых магазінах я ўжо высветліў, што папярэдні збор заказаў на мастацкую літаратуру (маецца на ўвазе той жа тэматычны план выдавецтва «Беларусь») па сутнасці не практыкуецца. Аб'ём заказаў вызначаюць самі работнікі магазіна. А. П. Зарыцкі пацвярджае, што гэта сапраўды так. Цікаўлюся, якое, на яго думку, мае значэнне тэматычны план увогуле, ці памагае ён у рабоце. «План нам, работнікам кніжнага гандлю, патрэбны, — адказвае А. П. Зарыцкі. — Ён арыентуе нас, дзякуючы яму мы ўжо загадзя ведаем, што будзе ў наступным годзе на кніжных паліцах, адпаведна настройваем сваіх пакупнікоў. Ды і самі яны — не ўсе, вядома, а найбольш цікаўныя — знаёмяцца з планам. А гэта ўжо дае нейкую карысць...»

Размова з А. П. Зарыцкім пераканала мяне ў тым, што тэматычны план усё ж робіць сваю справу. Але... калі трапляе ў добрыя, надзейныя рукі. І сапраўды. Тэматычны план — гэта першая ластаўка, першы вястун новай кніжнай вясны. У ім, як у люстры, бачыш усю доўгую чараду кніг, што выляцяць з выдавецкага гняздоўя на працягу пэўнага часу. Бачыш усю чараду, бачыш і асобныя кнігі. Калі імя аўтара вядома, то яно ўжо гаворыць само за сябе. Тут можна абысціся і без анатацыі, якою суправаджаецца кожнае выданне (гаварылі мы, дарэчы, з Зарыцкім і пра анатацыі). Калі невядома — прыходзіць на дапамогу анатацыя.

Так, план выпуску літаратуры на новы год — рэч патрэбная, карысная. Але ці выкарыстоўваецца ён як след? Не, не заўсёды. Аб гэтым наглядна сведчаць тыя факты, пра якія гаварылася вышэй. Нейкая частка дзесяцітысячнага тыражу плана выдавецтва «Беларусь» не даходзіць да адрасата — да пакупніка, чытача і часам нават, як мы бачылі, да кнігапрадаўца. Не даходзіць і, такім чынам, не дасягае сваёй мэты. Асабліва характэрна гэта для кнігагандлёвай сеткі спажыўкаперацыі, у сістэме якой знаходзяцца і Рагачоўскі, і Слуцкі, і многія іншыя кніжныя магазіны. А гэтага не павінна быць.

В. ІЛЫН.

Надрукавана ў «ПОЛЫМІ»

КУДЫ ЛЯЦЯЦЬ ГАЛУБЫ...

І задыміўся бікфордаў шнур дэтэктыву: «Падпольшчыкаў узялі ўночы. Проста з пасцелі. Усіх, дваццаць шэсць чалавек. Пяць мужчын, семнаццаць жанчын і чатыры падлеткі...»

Міжволі пачынаеш чытаць гэтую аповесць Барыса Сачанкі («Пакуль не развіднела», «Полымя» № 8, 1965) з лёгкім недаверам да яе мастацкай вартасці. І, прызнаюся, гэта пачуццё не пакідала мяне, нават калі была перагорнута ўжо трэць старонак твора... Дзіўна — яны ішлі, нібы спрачаючыся за аповесць, пачаргова мяняючы ўражанне ад яе, — старонкі з свежымі назіраннямі, штрыхамі, з-за якіх гут жа ўставаў жывы партрэт, чалавечы характар і мясціны, эмацыянальна сцёртыя, апусцелыя, дзе даўно ўжо ўсё «звезлі з поля».

Пасля трывожных радкоў пра разгром падполля сустракаеш у аповесці каменданта раёна Ганса Вінкеля. Ёсць пэўны давер да «нявыдуманасці» гэтага вобраза. Вось яму ўдалося накрыць падполле, і цяпер, заручыўшыся згодаю вышэйшага камандавання, ён выклікае тры суседнія гарнізоны, каб раз назаўсёды разлічыцца з партызанамі.

У тым, як ён разважае, што аблажыць усе бліжэйшыя вёскі, перакрыць дарогі павінны паліцаі, а не немцы, — каб не выклікаць падазрэння, бо гэта адразу кінулася б у вочы людзям і яны разгадалі б яго план, — бачыш нейкі «свой падыход», сваю тактыку гэтага ваякі, бачыш спробу пісьменніка індывідуалізаваць вобраз і ўжо чакаеш наступных падзей. Але вось адбываецца сустрэча з начальнікам паліцыі (якога ён выклікаў, каб аддаць загад) і ледзь Коўцік адчыніў дзверы і гучна загаварыў «хрыпаватым (напэўна ж з перапою!—**Ан. К.**) голасам і ляпнуў абцасамі новых хромавых ботаў» (відаць, рабаваных!), а пасля ўсміхнуўся «ліслива, пасабачы», а камендант, раскрычаўшыся, у ярасці не падыходзіў, а «падкрадаўся на насочках ціха, бы кот, і ўжо не гаварыў, а шыпеў»,—і ў чытача ўсякія надзеі на мастацкую свежасць і непаўторнасць рухнулі тут жа.

І тым не менш, не зважаючы на падобныя мясціны, твор жыве, паступова ўсё больш і больш прыцягвае да сябе, і ты не хочаш адрывацца ад яго старонак, у якіх невідочна прысутнічае, інтрыгуючы, «працяг будзе». Твор разгортваецца мэтанакіравана, ён напісаны на нейкім адным дыханні. Чытаеш і бачыш — элементы дэтэктыўнага плана, якія ёсць у аповесці, не разлічаны чыста на эфект у чытача, аўтар імкнецца падмацоўваць іх рэалістычным паказам сапраўды вострых драматычных падзей. І ты сочыш за дзяўчынай, якая з першым сваім заданнем ужо ад новага падполля, што ўстае на змену схопленаму фашыстамі, прабіраецца з мястэчка паўз нямецкі заслон да партызан, каб папярэдзіць іх аб экспедыцыі карнікаў.

Асцярожна, незаўважанай праходзіць яна паўз хвойнік, з якога чуцён трэск аўтаматаў: там расстрэльваюць фашысты людзей; сёння, магчыма, тут упадзе і не адзін з тых, каго ўчора ноччу ўзнялі з пасцелі. І дарога дзяўчыны — гэта не толькі дарога праз спакутаваную і спустошаную вайною зямлю, гэта дарога праз ўспаміны.

Гэта — дарога праз тыя даваенныя гады, і шчаслівыя, і горкія, праз дваццаць дзевяты і трыццаць сёмы, якія прайшлі па гэтай зямлі, па гэтых людзях...

Ясна бачыш задуму Б. Сачаркі паказаць гераіню на скрыжаванні вялікіх дарог гісторыі, асветленых зарывам вялікіх падзей, паказаць, што сённяшні дзень не пустадомак, у яго ёсць свая гісторыя, свая «спадчына», бо ён вырастаў з учарашняга...

Ёсць пэўны гістарычны разварот у гэтай аповесці і, чытаючы, бачыш добрую вучобу пісьменніка ў Кузьмы Чорнага. Праўда, яе пазнаеш часам аж занадта, як, скажам, вось у гэтым партрэце гераіні: «не надта прыгожая з твару, уся ў рабацінні, да таго ж цыбатая і худая... Велікаваты, на ўсім відаць, матчын, сачак сядзеў на плячах мешкавата, нехлямяжа, босыя ногі былі запыленыя і парэпаныя, а паркалёвае плаще выцвіла так, што цяпер нават ніхто не сказаў бы, якое яно было новае — не то сіняе, не то зялёнае...» Але прыемна радуе, што Б. Сачанка ў Чорнага вучыцца таму высокаму майстэрству, з якім Кузьма Чорны, як ніхто ў беларускай літаратуры, умеў адначасова, непадзельна паказваць, разгортваць і свет і чалавека ў іх непарыўнасці і супольнасці. І сённяшняя аповесць Б. Сачанкі ўжо не так багатая на голыя «незалежныя ад героя» апісанні, якія часам сустракаліся ў яго ранейшых творах. Аднак і цяпер ён падрабязна апісвае спёку, а як дзяўчына пераносіць яе, пакутуе з-за яе, агаворваецца скупым радком. Але тое, што бачыць дарогаю дзяўчына, не толькі добра перадае самую дарогу, у гэтым малюнку добра відаць і ўспрыманне гераіні. Гэта апісанні прыроды, з якіх добра «чытаецца» характар чалавека. Праўда, і тут сустракаюцца сякія-такія выдаткі, калі падчас з прыёмам Чорнага пераносіцца ў аповесць і чорнаўскі герой. Вельмі арганічна для гераіні Б. Сачанкі, калі яна, ідучы праз поле, бачыць яго такім: «...Цяпер у вайну, яно парэзана на дробныя вузенькія загончыкі. Лапінка ячменю, лапінка бульбы, лапінка жыта, зноў бульбы, зноў ячменю, зноў жыта... На такое поле неяк дзіўна глядзець»...

І зусім другое, калі яна глядзіць на скошаны лужок ля дарогі. «Відаць, той хто тут касіў, добра ведаў, што пакідаць сена ля дарогі нельга, — кожны, хто будзе сюдою ехаць, ускубе ці каню, ці сабе пад бок, каб не мулка было трэсціся на голых драбінцах, і перавёз яго адразу ж дахаты, бо ні стажка, ні коп нідзе поблізу не было відаць». Не можаш не радавацца пластычнасці гэтага малюнка. Але ці магла вось так па гэтаму лужку «чытаць» пра звезенае сена дзяўчынка? Леапольд Гушка мог бы, вядома, заўважыць. Міхал Тварыцкі несумненна ўбачыў бы гэта, але не зусім абавязкова падумалася пра гэта местачковай дзяўчыне, якая ўвесь час вучылася, а калі працавала на полі, то толькі ўрыўкамі, дзеля ахвоты, бо, звычайна, лета было для яе адпачынкам. І недарэмна ў папярэднім малюнку бульба для яе зарасла не проста «пустазеллем», а «малачаем, драсёнам, свірэпаю, лебядою, пырнікам».

Можа гэта і дробязі, але ад аўтара ўсё ж хацелася б большага пранікнення ў свет гераіні, каб свет гэты больш непаўторна ўставаў перад чытачом.

І ўсё ж ні адна з ранейшых аповесцей Б. Сачанкі не вылучалася такой увагай, такой засяроджанасцю да ўнутранага свету героя, нідзе так у ранейшых ягоных творах асяроддзе, апісанне не ўваходзіла так арганічна ў тканіну твора, як у новай аповесці.

Б. Сачанка як бы адчуў, што не толькі «сціслась — сястра таленту», а і разгорнутасць таксама не менш важна. Трэба даць чытачу мажлівасць «пабыць» з героем, даць «ужыцца» ў яго. І таму ў апошніх творах сюжэт у яго вядзе пераважна адзін герой. Прыгадайце хоць бы «Дзіка-бадзягу»—найбольш спелую рэч пісьменніка.

«Пакуль не развіднела» яскрава паказвае, што Б. Сачанка пачаў сур'ёзна клапаціцца аб псіхалагічным напаўненні твора. Вядома, не ўсё яшчэ ўдалося ў аповесці. Тыя ўнутраныя маналогі, маналогі-ўспаміны, якія праходзяць праз увесь твор, перадаюцца пісьменнікам яшчэ не ў сваёй першай непасрэднасці, яны як бы «адрэдагаваны» аўтарам, пераказаны. Мне здаецца, Б. Сачанка недастаткова выкарыстоўвае мажлівасці, якія сёння дае няўласнапростая мова для паказу характару, калі пісьменнік на момант як бы забываецца, што ён перадае думкі свайго героя, а той сам перахоплівае ініцыятыву і пачынае гаварыць, «думаць услых» і дзе ты, чытач, ужо не толькі сочыш плынь апавядання, а чуеш інтанацыю, бачыш нараджэнне, выспяванне і думкі і эмоцыі. Тады б, магчыма, у працяканні гэтых успамінаў у гераіні была большая ўнутраная логіка, яны падчас не звязваліся так механічна з тым, што яна бачыць, што трапляецца ёй на вочы...

Але працягнем далей чытаць аповесць. Як ні старалася Юля абысці заслоны, яе ўсё ж затрымалі паліцэйскія. Яна не выканала б свайго першага задання, калі б не начальнік валаснай паліцыі Шылахвост, які беспамылкова ўгадаў у ёй партызанскую сувязную і якому вельмі ж ужо дзеля свае кар'еры неабходна было, каб яна дайшла да партызан.

Вобраз Шылахвоста — своеасаблівы ў аповесці, ён — несумненная ўдача пісьменніка. Запамінальна, жыва выпісаны, ён непадобны да тых літаратурных здраднікаў, якія прымільгаліся аж да штампа. Так і бачыш яго, засяроджанага, усяго ў нейкай напружанай рабоце яго кар'ерысцкай думкі.

Сцэны, у якіх выведзены здраднікі, пададзены аўтарам каларытна, жыва. Перад намі праходзіць поўны ўнутранай драмы вобраз Цапка, якога бацька дзеля свайго дабрабыту адправіў у паліцыю. Цапок-сын думае цяпер толькі пра гарэлку. Праводзячы Юлю, ён адкрываецца ёй: «Я заўсёды так раблю, калі нешта нейкае чакаецца... Тады падымаюць-падымаюць, ставяць-ставяць на ногі, дый плюнуць... Не хачу сваёй рукамі паскудства рабіць, людзей сваіх забіваць...»

Але дарэмна думала Юля, вырабіўшыся з лапаў паліцаяў, што ёй лёгка будзе цяпер дабрацца да партызан. Усё аказалася куды больш складаным. Аповесць разгортваецца так, што якраз цяпер на долю дзяўчыны прыходзяцца самыя цяжкія выпрабаванні. Там, дзе павінна была сустрэцца з партызанамі, яна іх не знайшла...

Гэтыя старонкі, поўныя ўнутранага драматызму, чытаюцца з неаслабным напружаннем. Чытач далучаецца да трывожнага і трапяткога пачуцця подзвігу, які робіць дзяўчына.

Юля так і не паспела. Падыходзячы да вёскі, яна пачула стрэлы і адчула, як цягне дымам.

Пачуццё мастака прадыктавала прывесці гераіню да гэтага пажару. І я чакаў ужо ўбачыць яе на самым высокім грэбні яе перажыванняў, асветленай высокім полымем драмы. Але аўтар тут жа здымае ўсю драму. У вёсцы, выяўляецца, людзей ужо не было. Людзі ўцяклі.

І аповесць заканчваецца так:

«...Ні Юля, ні нават Падабед не ведалі, што ў той дзень, калі выйшла з мястэчка Юля, толькі на некалькі гадзін раней, па дарозе ў Доўгі Мох пайшла і яшчэ адна дзяўчына і што яна, гэтая дзяўчына, несла партызанам тыя ж звесткі, што і Юля... Паслаў яе, гэтую дзяўчыну, да партызан чалавек, што таксама быў у падполлі, і пра тое, што ён у падполлі, не ведалі ні Падабед, ні ў нямецкай камендатуры...»

Ёсць вялікая сіла абагульнення і ў гэтых заключных радках (хоць, як я казаў, мне менш падабаецца такі «эпілог» аповесці). Не Юля, дык другая, а не яна, дык іншы хто стаў бы носьбітам гэтага народнага гневу. Бо ніколі чалавек не можа раўнадушна зносіць прыгнёт. Бацькаўшчыне не быць пад чужынцам! Бо і без эпілога на гэтай дарозе подзвігу, якой ідзе Юля, — бачу я і тую жанчыну, якая перастрэла дзяўчыну перад Млынком, каб сказаць пра засаду паліцыі; бачу бацьку яе, які, адсутнічаючы, ідзе поплеч з ёю. Праз усю аповесць чую, як даносіцца з даваенных гадоў сюды ў гэты лес, яго голас, выводзячы яе да людзей на дарогу: «калі... ты заблудзішся ў лесе, высачы, куды ляцяць галубы. Там... поле...» «Запамятай... калі праблыцяешся ў лес, дарогі разыходзяцца, развінаюцца ў розныя бакі. Калі выходзіш з лесу, набліжаешся да людскога паселішча, дарогі збіраюцца, сыходзяцца ў адну. Дарогі наогул вытоптваюць і пракладваюць людзі, а чалавеку трэба разумець другога чалавека заўсёды, што б ён ні рабіў. Разумець нават па тых самых дарогах...»

Я чытаў аповесць і адчуваў, як яе старонкі даюць магчымасць яшчэ глыбей зразумець, чаму тут на гэтай зямлі магло адбыцца тое, за што і сёння завуць у свеце Беларусь краінай класічнага партызанскага руху.

На жаль, тут не можаш спыніцца на ўсім, на чым хацелася б,—на дакладнай рабоце ў творы працавітага, рупнага слова, на цудоўных старонках пра лес, выпісаных з густам, сакавіта, паўнафарбна, пра лес, пошумам якога ўскалыхана ўся аповесць.

Ан. КЛЫШКО.

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

«МАЛАДЗЕЧАНСКІЯ ДЫЯЛОГІ»

Рэдакцыя газеты атрымала пісьмы з Маладзечна сваіх чытачоў М. Лазара і Г. Каханоўскага, якія паведамлялі, што ў іх горадзе недастаткова аддаецца ўвагі прапагандзе і распаўсюджванню беларускіх літаратурных выданняў, твораў беларускіх пісьменнікаў. У Маладзечна выязджаў карэспандэнт газеты А. Вярцінскі. У нумары за 3 жніўня г. г. ён выступіў з артыкулам «Маладзечанскія дыялогі».

Днямі рэдакцыя атрымала адказ загадчыка Маладзечанскага гарадскога аддзела культуры тав. Сурпіна, якому артыкул быў пасланы на рэагаванне. «Гарадскім аддзелам культуры,— паведамляе тав. Сурпін,—праведзена вытворчая нарада бібліятэчных работнікаў, на якой абмеркаваны артыкул А. Вярцінскага «Маладзечанскія дыялогі». Крытыка прызнана правільнай, намечаны меры па выпраўленню недахопаў. Па аддзелу культуры аддадзены загад, які абавязвае неадкладна папоўніць кніжны фонд гарадскіх бібліятэк творамі беларускіх празаікаў і паэтаў, палепшыць прапаганду беларускай літаратуры і масавую работу з чытачамі.

Зроблена практычна наступнае: для бібліятэкі № 2 дадаткова выпісаны часопіс «Маладосць» і газета «Літаратура і мастацтва». Пры апошнім камплектаванні фонды цэнтральнай бібліятэкі і бібліятэкі № 2 папоўнены навінкамі беларускай літаратуры. Пасля таго, як пачне працаваць зноў абласны бібкалектар (зараз ён закрыты на рамонт) пытанне гэтае будзе вырашана поўнасцю.

Гаркомам КПБ звернута ўвага работнікаў кніжнага гандлю на тое, каб палепшыць прапаганду і гандаль навінкамі беларускай літаратуры».

Вясёлая, іскрыстая, любімая тысячамі і тысячамі гледачоў купалаўская «Паўлінка»... Вось ужо каторы год спектаклем па гэтай цудоўнай п'есе адкрываецца кожны новы сезон у Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Засталіся вернымі гэтай традыцыі купалаўцы і сёлета, калі 11 верасня пачалі свой сорак шосты сезон.

У спектаклі былі заняты артысты Б. Дакальская, Ул. Дзядзюшка, Л. Ржэцкая, З. Стома, В. Поле, Ул. Кудрэвіч, Т. Кін-Камінскі і іншыя.

Наш фотакарэспандэнт Ул. Крук пабываў у тэатры перад пачаткам спектакля і зрабіў гэты здымак, калі рэжысёр-асістэнт С. Бірыла гутарыў з выканаўцамі.

ДЗЕ ВАРЫЦЦА ШКЛО І КРЫШТАЛЬ

Дарога на Нёман-раку пачынаецца тут жа, побач з заводам «Нёман». Іду бліжэй да ракі — і тысячы драбнютніх сонцаў іскрацца і пераліваюцца пад нагамі. Даганяю басаногую дзяўчынку, якая вядзе за руку галавастага хлопчыка, здзіўлена пытаюся ў яе:

— Як ты ходзіш босая? Тут жа шкло...

— А я прывыкла, — адказвае малая. — І Валік прывыкны... Мы ходзім сюды на пяскі гуляць...

Дзяўчынка памаўчала і дадала:

— Будаваць казку.

І яна цягне за руку малога да кучы бітага ш

А РАПТАМ І СЮДЫ ЗАЛЯЦІЦЬ МЯЧ...

Фотаэцюд нашага чытача С. ДАРОЖКІ (Любань).

МІНУЛАЕ ХВАЛЮЕ, МІНУЛАЕ ВЫХОЎВАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар).

раённыя (гарадскія) і абласныя канферэнцыі аддзяленняў Таварыства, а ў першай палавіне наступнага года збярэцца з'езд членаў Таварыства, які прыме статут гэтай добраахвотнай арганізацыі. Між іншым, кожны член Таварыства будзе мець значок. Мяркуецца, што члены Таварыства атрымаюць інспектарскія правы кантролю за захаваннем помнікаў мінулага.

Усю сваю работу Таварыства будзе весці на ўласныя сродкі, без дзяржаўнай датацыі, у самай цеснай сувязі з органамі дзяржаўнай аховы помнікаў мінулага, з правам уваходзіць са сваімі прапановамі ў гэтыя органы.

Што, на ваш погляд, адносіцца да помнікаў мінулага, якія перш за ўсё неабходна ўзяць пад ахову? Як багата імі Беларусь?

— Для нас вялікае значэнне мае ўсё, што з'яўляецца сведчаннем нашай гісторыі, сведчаннем таленту, фантазіі, працы нашых продкаў. Пад ахову трэба ўзяць перш за ўсё гісторыка-рэвалюцыйныя, архітэктурныя, археалагічныя помнікі, помнікі мастацтва. У рэспубліцы выяўлена ўжо каля 2 300 помнікаў, якія раскрываюць шматвяковую гісторыю беларускага народа, пачынаючы ад часу Кіеўскай Русі. Сярод іх помнікі Айчыннай вайны 1812 года, Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайны 1941-45 гадоў. Мы маем каля ста помнікаў архітэктуры, пятнаццаць з якіх маюць усесаюзнае значэнне.

На тэрыторыі рэспублікі выяўлена каля 10 тысяч археалагічных помнікаў — паселішчаў, гарадзішчаў, курганаў, пры раскопцы якіх адкрываюцца новыя старонкі мінулага. Звыш трохсот з іх прыняты пад ахову дзяржавы.

Ужо адны гэтыя лічбы сведчаць, што Беларусь мае багатую гісторыю, якой кожны беларус мае права ганарыцца.

Відаць, не будзе памылкай сказаць, што большасць нашых землякоў ведаюць толькі некаторыя, найбольш значныя, помнікі мінулага беларускага народа, ды і то часам па назвах. Што будзе рабіць Таварыства, каб палепшыць папулярызацыю помнікаў мінулага?

— Зусім справядліва сказана, што мы часам не толькі не чуем голасу далёкіх вякоў, а і не ўмеем размаўляць з ужо вядомымі помнікамі, не разумеем іх мовы. Вазьміце сціплы абеліск на брацкай магіле. Хто ў ёй пахаваны? Што зрабілі гэтыя людзі для Радзімы? Чым слаўная зямля, у якой яны ляжаць? Як часта мы не можам адказаць на гэта. І абавязак членаў Таварыства рабіць усё, каб кожны помнік «загаварыў», каб «загаварыла» наша зямля, каб ніводзін подзвіг не быў забыты. Неабходна весці вялікую краязнаўчую і навуковую работу.

Трэба шырэй знаёміць людзей і з ужо вядомымі помнікамі. Я маю на ўвазе арганізацыю фотавыставак, выпуск фотаальбомаў, буклетаў, падборак паштовак, плакатаў. Мы мяркуем стварыць сваё экскурсійнае бюро, будзем выдаваць даведнікі і навукова-папулярную літаратуру. Магчыма, удасца наладзіць выпуск перыядычнага часопіса. Нашы калегі з аркамітэта такога ж Таварыства, створанага ў Расійскай Федэрацыі, плануюць нават арганізацыю школ і курсаў для падрыхтоўкі гідаў. Думаю, што гэта варта пераймання.

Вялікі ўклад ва ўсю гэтую справу могуць унесці нашы пісьменнікі, архітэктары, гісторыкі, мастакі. Нядрэнна было б, каб нашы газеты і часопісы перыядычна знаёмілі чытачоў з найбольш каштоўнымі помнікамі мінулага.

У некаторых савецкіх рэспубліках, напрыклад, Грузіі, такія Таварыствы існуюць ужо некалькі год. Ці мае аркамітэт з імі сувязь, ці ведае іх вопыт?

— Вядома, аркамітэт бярэ пад увагу ўвесь вопыт, які ёсць у гэтай справе. Шмат цікавага даведаліся мы ад таварышаў з Прыбалтыкі, Арменіі і асабліва з Грузіі. Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ў Грузіі працуе з 1959 года. Як піша ў часопісе «Искусство» міністр культуры Грузінскай ССР тав. Буачыдзе, Таварыства за гэты час правяло вялікую работу па выяўленню, ахове і папулярызацыі помнікаў гісторыі грузінскага народа. У радах Таварыства цяпер налічваецца каля паўмільёна актыўных членаў.

Упэўнены, што і грамадскасць нашай рэспублікі прыме самы актыўны ўдзел у выяўленні і вывучэнні гістарычнай і культурнай спадчыны.

Што б вы хацелі пажадаць нашым чытачам?

— Хацелася б, каб кожны з іх стаў членам нашага Таварыства, бярог усё тое, што звязана для кожнага з вялікім і цудоўным пачуццём Радзімы. Карыстаючыся выпадкам, хачу паведаміць адрас аркамітэта, на які можна дасылаць свае прапановы і пажаданні: г. Мінск, Ленінскі праспект, 25-а, Дзяржаўны музей БССР.

Выходзяць на экран

ФІЛЬМЫ АБ МАСТАЦТВЕ

«НОЧЫ НА ВОЛЗЕ»

У фільме расказваецца пра творчасць вялікага рускага драматурга А. М. Астроўскага.

Назіранні нораваў і быту жыхароў гарадоў Паволжа памаглі пісьменніку ў стварэнні жывых і ярніх вобразаў яго твораў. У фільме паказаны героі п'ес А. М. Астроўскага, месцы, дзе ён бываў, дом, у якім пісьменнік пражыў значны час. Фільм прыадкрывае творчую лабараторыю драматурга.

Вытворчасць Куйбышаўскай студыі кінахронікі. Аўтары сцэнарыя — С. Розен, Е. Холадаў, рэжысёр — В. Акопаў.

«КАЧАЛАЎ»

Фільм пра вялікага рускага артыста Васіля Іванавіча Качалава прызначаецца для паказу шырокаму гледачу, слухачам універсітэтаў культуры, студэнтам тэатральных вну і вучылішчаў.

У карціне сабраны унікальныя матэрыялы, знятыя ў розныя перыяды жыцця артыста: фрагменты са спектакляў «На дне» (Качалаў у ролі Барона), «Вішнёвы сад» (Качалаў — Гаеў), урыўкі з яго канцэртных выступленняў — «Клейкія лісточкі» па Дастаеўскім, «Дванаццаць» Блока, «Уваскрэсенне» (ад аўтара) Талстога і многія іншыя. У фільме даволі падрабязна паказаны творчы шлях артыста.

Вытворчасць Маскоўскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтар сцэнарыя — В. Крэпс, рэжысёр-пастаноўшчык — А. Кустоў.

«ПЕСНЯ І ТАНЕЦ»

Вялікім поспехам карыстаюцца песні заслужанага артыста Малдаўскай ССР Мікалая Кулака і танцы народнага артыста рэспублікі Спірыдона Мокану. Іх мастацтва вядома не толькі ў Малдавіі, але і далёка за яе межамі. Фільм расказвае пра самабытнасць творчасці гэтых двух артыстаў.

Вытворчасць кінастудыі «Малдова-фільм». Аўтар сцэнарыя — Р. Лунгу, рэжысёр-аператар — В. Калашнікаў.

«ПЕРАЙНАЧАНЫЯ КАРЭННІ»

Нарыс знаёміць з творчасцю румынскага скульптара па дрэву Віда Гезе, які з карэнняў ссечаных дрэў стварае творы мастацтва.

Вытворчасць студыі дакументальных фільмаў імя Аляксандру Сахія (Румынія). Аўтар сцэнарыя і рэжысёр — Мірэл Ілієшу.

ПА СТАРАЖЫТНЫХ ГАРАДАХ РАСІІ

«Архітэктура — той жа летапіс свету. Яна гаворыць тады, калі ўжо маўчаць і песні, і паданні», — пісаў Мікалай Гогаль. Гэтыя словы вялікага рускага пісьменніка сталі нібы эпіграфам да нядаўна адкрытай у Маскве выстаўкі «Помнікі старажытнарускай архітэктуры ў творах маскоўскіх мастакоў».

Выстаўка, якая носіць рэтраспектыўны харктар, у той жа час мае глыбока сучасны сэнс і значэнне. Вялікая яе грамадзянская роля, бо наведвальнік знойдзе тут не адзін толькі архітэктурны пейзаж, ён убачыць і нешта большае: прыгажосць і веліч Расіі. Тут у жывапісным ізлажэнні прадстае гісторыя: са стагоддзя ў стагоддзе, з пакалення ў пакаленне ствараў рускі народ на бяскрайняй сваёй зямлі магутныя крэпасці і цнотна белыя храмы, узорыстыя распісныя палаты і драўляныя ветракі, заўсёды памятаючы не толькі аб карысці сваёй справы, але і аб прыгажосці.

Праходзячы па ярка асветленых залах выстаўкі, нібы рассоўваеш рамкі прасторы і часу: графічныя лісты і жывапісныя палотны ўзнаўляюць перад намі легендарны свет краіны— і вольнага «пана вялікага Ноўгарада», і строгіх вежаў Ізборска, і княскай вытанчанасці Уладзіміра, і гордага крамля Растова Вялікага, і дзяржаўнай залатагаловай Масквы, Угліча, Пераслаўля-Залескага, Суздаля, Пскова, Яраслаўля, Каргопаля, Волагды, Кірылава, Ферапонтава, Вялікага Усцюга, Галіча, Кастрамы, Судзіслаўля... Апавяданне пра мінулае Расіі ў многіх творах выстаўкі вядзецца на фоне лірычнага або сучаснага гарадскога пейзажу.

Побач з палотнамі энтузіяста рускага мастацтва Грабара нямала іншых твораў мастакоў старэйшага пакалення — Васняцова, Рэрыха, Юона, Кустадзіева, Канчалоўскага, Асмеркіна, Купрына, Фалька, Лянтулава.

Апалінарый Васняцоў большую частку свайго творчага жыцця аддаў мастацкаму адлюстраванню старажытнай Масквы ад першых дзён яе існавання, калі невядомыя нам цесляры ставілі на лясістым пагорку «рублены» горад, да росквіту ў XVII стагоддзі. На вядомай карціне 1894 года «Маскоўскі крэмль» мастак адлюстраваў частку крамлёўскай сцяны з белакаменнымі саборамі — нібы шлемы эпічных волатаў клубяцца галовы Успенскага, Архангельскага і Благавешчанскага сабораў. Палатно ўторыць велічным былінам старажытнасці, фарбы яго ўрачыстыя і парадныя.

Па-іншаму ўбачыў Русь Ігар Грабар у «Гарадку на Паўночнай Дзвіне». На выцягненым па гарызанталі палатне напісана наўмысна спрошчаная кампазіцыя. Высокі грэбень рачнога берагу. На аднатонным зялёным поземе — вясковыя дамы, пастаўленыя ў рад адзін да аднаго. Па схіле берагу цягнуцца платы; мутны прыбой калыша рыбацкія лодкі. Усё тут прасякнута суровай інтанацыяй: шэрае цяжкое неба, цёмныя хаты на высокіх падклецях, цьмяна мільгаюць вакенцы. Быт паўночнай вёскі перададзены дакладна і пераканаўча: ганкі-рундукі, крутыя скаты дахаў са слегамі, капліца, млын. Дакладнасць мастацкага адлюстравання выключае натуралізм, перад намі не копія нейкага канкрэтнага сяла, а паэтычны збіральны вобраз старых рускіх пагостаў, што раскінуліся па берагах глухіх рэк і азёр.

Увогуле для многіх твораў выстаўкі характэрныя вялікія абагульненні. Ці то копія наўгародскай фрэскі, гравюра або жывапіснае палатно, аўтары іх імкнуцца не проста адлюстраваць помнік, але ўнесці ў яго долю свайго разумення, адносін мастака. Іменна таму мы можам гаварыць пра двайныя эстэтычныя каштоўнасці экспазіцыі: з аднаго боку, гэта прапаганда архітэктурных помнікаў, з другога — асоба самога мастака. Кожны з майстроў трох пакаленняў, прадстаўленых на выстаўцы, па-свойму, з нечаканага пункту, пры разнастайным асвятленні адлюстроўваюць адны і тыя ж помнікі. Так, на дзіва непадобныя рашэнні ноўгарадскай тэмы ў Сяргея Герасімава і Пятра Канчалоўскага, так, здзіўляюць гледача адкрыцці Мікалая Рэрыха, Эдуарда Брагоўскага і Віктара Іванова ў вобразе Растова Вялікага. Мы становімся саўдзельнікамі гэтых адкрыццяў, па-новаму ўспрымаючы знаёмы з дзяцінства помнік.

Сяргей Герасімаў стварыў цэлую серыю палотнаў, прысвечаных Ноўгараду («Крэмль», «Сабор святой Сафіі», «Руіны царквы Спаса-Нярэдзіцы», «Разбурэнні ў Ноўгарадзе»). Каларыт яго палотнаў прыглушаны, ён падкрэслівае суровасць архітэтурнага ансамбля крамля, сцяна якога цяжка навісла над шырокім Волхавам. Праслы Сафіі цёмныя, на іх бачыш сляды варварскіх разбурэнняў фашыстаў (мастак пісаў тут у 1944 годзе).

Інакш успрыняў і перадаў Ноўгарад Пётр Канчалоўскі. Лінія ў яго нясе больш пэўную сэнсавую нагрузку, ёю жывапісец падкрэслівае грузныя формы помнікаў, але больш за ўсё яго цікавіць святло, ён захоплены радасным зззяннем фарбаў.

Шмат пакаленняў жывапісцаў звярталіся да Растова. Мікалай Рэрых нібы лепіць круглыя вежы крамля, пабудаванага мітрапалітам Іонай Сысоевічам, які спрачаўся за патрыяршую ўладу з самім Ніканам. Мазок Рэрыха энергічны і моцны. Малады мастак Эдуард Брагоўскі, наадварот, піша шырока і плаўна, апускаючы дэталі, звязваючы архітэктуру з прыродай («Рады», «Барысаглебск»).

Шмат спрэчак на выстаўцы выклікаюць работы Івана Сарокіна, напісаныя тэмпераментна і нават смела. Яго «Кіжы» не падобныя на той храм, які многія бачылі на адным з паўтара тысяч астравоў Анежскага возера. Мастак пераасэнсаваў убачанае, стварыўшы паэтычны вобраз нястрымнай сілы: на фоне зеленаваталімоннага зззяючага неба ўзнялася шматгаловая піраміда Прэабражэнскага храма; цёмна-сіняя азёрная вада дыбіцца крутымі хвалямі.

Сярод 450 твораў выстаўкі агульную цікавасць выклікае карціна Кустадзіева «Масленіца». Імчаць распісныя сані-валакушы па снежных гарах. Расчырванеліся твары ездакоў, серабрыста звініць валдайскі званочак. Мароз. Сонца. Смех. Фарбы наіўныя, чыстыя, як у лубку. Шчаслівай радасцю натхніла мастака народнае свята. І здзіўленнем. Здзіўленнем перад прыгажосцю і сілай свайго народа, перад багатым мінулым сваёй зямлі. З гэтым добрым здзіўленнем пакідае выстаўку наведвальнік.

Сяргей РАЗГОНАЎ.
(АДН).

Па той бок

НЯШЧАСНЫ ВЫПАДАК?— НЕ, ЗАБОЙСТВА!

Доўгае імя маленькага Густаво Роберта Кабрэра Лопеса, які не паспеў праславіцца пры жыцці, цяпер ведаюць па ўсёй вуліцы Эміліо Ранья і нават ва ўсім Уругваі. Гэты 9-гадовы школьнік, імітуючы заключную сцэну з амерыканскага кавбойскага фільма, накінуў сабе на шыю пятлю з вяроўкі і, спатыкнуўшыся на падстаўцы, аказаўся павешаным. «Няшчасны выпадак? — Не, яго забілі!» — пішуць многія тутэйшыя газеты.

Па сведчанню бацькоў Густаво, іх сын, «як усе хлопчыкі яго ўзросту, быў нераўнадушны да амерыканскіх кавбойскіх фільмаў. Густаво літаральна жыў у гэтым свеце «смелых кавбояў», «бескарысных індзейцаў» і «гераічнага шэрыфа». Яго любімымі цацкамі былі пісталеты розных сістэм, лук, стрэлы, вяроўка.

Бацькі, суседзі, урачы, выкладчыкі—усе сцвярджаюць, што Густаво быў нармальным дзіцем, здольным вучнем. Ніхто не сумняваецца ў прычыне яго смерці. Яд быў закладзены ў стрэлы, пушчаныя амерыканскімі камерцыйнымі фільмамі, якія, не сустракаючы канкурэнцыі (Уругвай не мае сваёй кінапрамысловасці), спачатку запоўнілі экран кінатэатраў, а потым праз тэлебачанне пранікілі ў кватэры.

Уругвайскае таварыства акцёраў указвае, што 35 працэнтаў імпартуемых фільмаў «складаецца са стрэлаў, яду і іншага асартыменту насілля». Супраць засілля ўсёй гэтай амерыканскай макулатуры, або, як яе тут называюць, «жвачкі для вачэй і вушэй», выступаюць пісьменнікі, педагогі, урачы, юрысты Уругвая.

Я. ЯЛЬШОЎ,
карэспандэнт ТАСС.
Монтэвідэо.

НОВЫЯ ЭСТАМПЫ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ



Ул. САКАЛОЎ. «Вечар у порце». (Лінагравюра).

Куток калекцыянера

САВЕЦКІЯ МАРКІ Ў ІТАЛІІ

У дні XVII Міжнароднага кірмашу марак у італьянскім горадзе Рычоне адкрылася філатэлістычная выстаўка, на якую Міністэрства сувязі СССР накіравала экспазіцыю савецкіх паштовых марак.

Савецкая экспазіцыя адкрываецца шчытом, на якім аплікацыяй з марак зроблены партрэт Уладзіміра Ільіча Леніна.

На наступным шчыце з марак адлюстраваны Абеліск у гонар пакарыцеляў космасу, узведзены ў Маскве. Гэты шчыт адкрывае раздзел, які адлюстроўвае поспехі ў штурме космасу ад запуску першага штучнага спадарожніка. Зямлі да трыумфу савецкай навукі і тэхнікі — выхаду ў свабодны космас савецкага касманаўта з касмічнага карабля.

Другая тэма экспазіцыі — прырода СССР. Гэты раздзел таксама мае галоўны шчыт: кветку рамонкі і белыя ствалы бярозы, умела, памайстарску выкананыя з марак. Тут паказаны паштовыя мініяцюры з відамі Крыма, Каўказа, курортаў і санаторыяў, серыі «Грыбы», «Кветкі», «Рускія самацветы» і іншыя.

Трэці раздзел — спартыўны — адкрываецца стэндам, на якім выкананы з марак палаючы факел і пяць алімпійскіх кольцаў. Маркі расказваюць пра ўдзел савецкіх спартсменаў у спаборніцтвах па алімпійскіх відах спорту ў Скво-Велі, Рыме, Інсбруку, Мельбурне, Токіо.

АДН.

МІЖНАРОДНЫ ФЕЛЬЕТОН

ВОСТРАЎ ПІНГВІНАЎ XX СТАГОДДЗЯ

Анатоль Франс — чалавек вельмі рэалістычнага складу розуму — аднёс паяўленне дракона на востраве Пінгвінаў да «часоў невядомых». Як, магчыма, памятаюць чытачы, нягледзячы на страхі, якіх нацярпеліся тады старадаўнія пінгвіны, на крадзеж курэй і авечак, што па сваім эканамічным эфекце для тых часоў раўназначны біржаваму краху нашых дзён, і нават нягледзячы на такія вялікія вынікі, як устанаўленне алькскай манархіі, гісторыя з драконам скончылася для пінгвінаў добра: Пінгвінію выратавала ад дракона самая звычайная дагістарычная распусніца — дзева Арброза, за што і была далучана да ліку святых і стала нябеснай апякункай краіны.

Але дракон не быў бы драконам, калі б час ад часу не нагадваў аб сабе. Апошнія звесткі пра яго разбоі апублікавала газета «Дэтройт ньюс», у ЗША, дзе зноў з'явілася пачвара. Са слоў відавочцаў, газета апісвае яго, як нешта вышынёю па меншай меры ў сем футаў і вагою не менш 400 фунтаў. Усё цела пачвары і яе даўжэзныя рукі пакрыты доўгімі чорнымі валасамі. Яна паяўляецца толькі глыбокай ноччу, «узнікаючы з балот каля атамнай электрастанцыі імя Энрыка Фермі», недалёка ад горада Манро. Апошняя дэталь асабліва пераконвае ў праўдзівасці ўсяго здарэння: месцажыхарства дракона ўпаўне адпавядае духу навуковага прагрэсу — характэрнейшай рысе нашага XX стагоддзя.

Але ёсць яшчэ адно пераканаўчае сведчанне. Франс піша, што першым подзвігам дракона было выкраданне дзевы Арброзы, якую ён зрабіў сваёй жонкай. Па-чалавечаму гэта зразумела: бо нават дракону цяжка абысціся без жаночай ласкі. Сучасная пачвара ў ЗША пайшла па няправільнаму шляху свайго алькскага сабрата: «Дэтройт ньюс» публікуе фатаграфіі дзвюх сучасных Арброз — Крысцін Экер і Шырлі Морыс. Крысцін з гонарам дэманструе сіняк, які пасадзіла ёй пад вокам пачвара, спрабуючы выцягнуць дзеву з аўтамабіля. Шырлі выхваляецца агіднымі адмецінамі на руцэ, пакінутымі ёй на памяць пачвараю (скептыкі-ўрачы сцвярджаюць чамусьці, што адмеціны—апёкі ад уколу ядавітага плюшча).

Сучасныя Георгіі-Пабеданосцы беспаспяхова спрабавалі злавіць пачвару ці прыстрэліць яе. Устрывожаныя ўлады кінулі на дапамогу паліцэйскіх. Мясцовая паліцыя Манро і паліцыя штата Мічыган прачасалі ўсе раёны, дзе бачылі пачвару. У масавых аблавах удзельнічала да тысячы чалавек, узброеных самай разнастайнай зброяй: «лукамі і стрэламі, сачкамі для лоўлі бабачак, драбавікамі і электрычнымі ліхтарамі».

У гутарцы з карэспандэнтам газеты адзін з паліцэйскіх пескардзіўся на тысячы цікаўных, якія ў запале кінуліся на пошукі пачвары. «Гэтыя людзі, — сказаў ён, — за адну ноч могуць нарабіць такое, што за імі не ўгнацца ніводнай пачвары».

Але няма ліха без дабра. Уся гэтая «драканада» прынесла вялікую выгоду прынамсі дзвюм катэгорыям грамадзян горада Манро. Масавае палявание на невядомую пачвару прывяло да таго, што ва ўласнікаў прыватных бензакалонак і гаспадароў невялікіх рэстаранаў падвоіўся аб'ём дзелавых аперацый і адпаведна прыбыткаў.

Не прагадала і газета «Дэтройт ньюс». Для яе гісторыя з драконам аказалася знаходкаю—бо не пра становішча ж у Лос-Анжэласе або пра В'етнам пісаць амерыканскай газеце, якая паважае сябе.

А. КАЗАКОЎ.
(ТАСС).

Цемешкі Балгарыі

Георгій ДРУМЕЎ

НА СЦЭНЕ—ЯК І Ў ЖЫЦЦІ

(Памятка гледачу)

Чалавек не заўсёды можа атрымаць патрэбную адукацыю. Таму мы і вырашылі пазнаёміць гледача, які пачынае актыўна наведваць тэатр, з некаторымі тэарэтычнымі назіраннямі.

Дык вось. Спектаклі бываюць двух відаў: адкрытыя і закрытыя для публікі. Ва ўсіх выпадках найбольшы ўплыў на публіку маюць закрытыя спектаклі. Таксама, як і не ў тэатры.

У тэатры амаль на ўсіх білетах указана месца, і гледачы, хто б яны ні былі, знаходзяць, нарэшце, кожны сваё месца. Таксама, як і ў жыцці.

Калі на адно месца з'явяцца два кандыдаты, перавагу мае той, хто сеў першы. Але калі той, хто спазніўся, мае знаёмства з тымі, хто ў тэатры кіруе, традыцыя можа быць парушана. Гэтак жа, як і не ў тэатры.

У кожным выпадку чалавек атрымлівае месца адпаведна таму, колькі ён заплаціў. Даражэйшыя месцы напярэдзе. Там ты павінен і слухаць уважлівей — становішча абавязвае. Калі ў цябе таннейшае месца, ты можаш рабіць заўвагі пра ігру акцёра гучней. Таксама, як і не ў тэатры.

Існуе тысягадовая традыцыя, згодна якой некаторыя гледачы маюць забраніраваныя загадзя месцы. І білеты на гэтыя месцы не прадаюцца. Гэтак жа, як і не ў тэатры.

Акцёрам плацяць за тое, што яны гавораць раней напісаны кімсьці тэкст. Калі яны пачынаюць гаварыць сваё, інакш кажучы, тое, што яны думаюць, ім звычайна раяць падумаць. Гэтак жа, як і не ў тэатры.

Гледачы вельмі часта крычаць «біс» і «брава» тым акцёрам, якія гучней гавораць. Таму што публіка робіцца ўсё больш патрабавальнай. Таксама, як і не ў тэатры.

Калі публіка маўчыць, гэта не заўсёды азначае, што яна згодна з тым, што гавораць на сцэне. Бо не ўсякае маўчанне азначае згоду. І калі чуюцца воплескі, гэта не заўсёды азначае, што публіка згодна з тым, што гавораць на сцэне, бо не ўсякія апладысменты — знак згоды. Гэтак жа, як і не ў тэатры.

Адны пакідаюць сцэну ў апагеі славы. Другія — калі іх адсылаюць на пенсію. Гэтак жа, як і не ў тэатры.

Наогул, мастацтва акцёра — вялікае, адказнае і неабходнае для грамадства, нават тады калі мастацтва так і не стала прафесіяй акцёра.

Адным словам, пачынаючаму гледачу можна смела параіць хадзіць у тэатр.

Толькі не заўсёды варта верыць афішам — часам другі склад іграе лепш, чым першы.

Ясен АНТАЎ

КАЛІ ТЫ НЕ ТРАПІЎ У ПЛАН

Як гэта ні дзіўна, тэраіняй гэтай гісторыі, звязанай з праблемамі планавання, з'яўляецца грамадзянка Анастасія Дэкава, альбо бабка Сійка, як яе называла ўся вуліца.

Нарадзілася яна аж у 1878 годзе. Бабка Сійка мела магчымасць бачыць нават князя Аляксандра Міхайлавіча Дундукава-Корсакава. Мы гаворым пра яе ў мінулым часе, таму што бабка Сійка ўжо адышла на той свет. І, па сутнасці, уся гісторыя пачалася пасля, альбо, як гавораць адукаваныя людзі, «пост фактум».

Пасля таго як бабка памёрла, яе сыны— Дэка Дэкаў і Гога Дэкаў склікалі сямейны савет, зрабілі фінансавы разлік кошту ўсёй цырымоніі, якая мелася адбыцца, і размеркавалі выдаткі.

Але не гэта самае істотнае ў нашай гісторыі. Куды важней для сыноў было атрымаць заключэнне аб смерці з бальніцы, дзе бабка Сійка знаходзілася ў апошні свой месяц. Раптам высветлілася, што няма чалавека, які мог бы падпісаць заключэнне. Урач, які лячыў бабку, быў у адпачынку. Канстытуцыя рэспублікі дала яму права на адпачынак, і ён выкарыстаў гэтае права.

Тады Дэка і Гога звярнуліся да яго калегі, але апошні абвясціў, што ён хворы. Другі яго калега паведаміў, што ён панінен адвесці сваё дзіця ў піянерскі лагер і таму ўзяў адпачынак за два дзяжурствы на мінулым тыдні.

Сыны бабкі Сійкі ў адчаі звярнуліся тады да швейцара, які ім ветліва растлумачыў, што ва ўсім вінаваты шафёр санітарнай машыны. Ён наогул не вельмі клапаціўся пра сваю машыну. У той дзень, калі дактары пераканаліся, што бабка вельмі хворая і жыць ёй засталося зусім мала, яе вырашылі адвезці дадому. Але матор не заводзіўся. Дактары доўга лаялі шафёра, той корпаўся ў машыне, пацеў, пыхцеў, пакуль бабка Сійка не сканала.

— І так здарылася, — скончыў апавядаць швейцар, — што яна памёрла ў бальніцы і гэтым павялічыла працэнт смяротнасці ва ўстанове, якая спаборнічае з бальніцай горада К. Летась наша бальніца недавыканала план, дык прыехала начальства і ўстанавіла цвёрдыя лічбы, якія цяпер ніхто не хацеў парушыць.

Дэка і Гога Дэкавы выкурылі яшчэ па цыгарэце, падумалі пра сілу планавання і нават былі гатовы згадзіцца з доказамі швейцара. Але тут жа прыгадалі, што ўжо два дні прайшло, як памёрла бабка Сійка, і рушылі зноў. Урэшце яны прыйшлі да галоўнага ўрача, выказалі яму ўсё, што думалі, у тым ліку і тое, што ў тыя дні была летняя гарачыня. І галоўны ўрач не змог адмовіць ім і паставіў подпіс там, дзе патрэбна.

Так скончылася гэтая сумная гісторыя «пост фактум». Каб фінал яе быў усё ж такі светлым, паведамім, што бабка Сійка, якая памёрла звыш плана, была вельмі радасна сустрэта гаспадарамі на могілках. Яны яшчэ не выканалі свайго плана, і ім былі патрэбны такія кліенты. Так што развітальная цырымонія прайшла добра, нават з лёгкім адценчем аптымізму.

Пераклад з балгарскай мовы.

Літаратура і мастацтва 4

Аўторак, 14 верасня 1965 года

ТЭЛЕБАЧАННЕ

14 верасня

Першая праграма. 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15—«Лісы Аляскі». Шырокаэкранны мастацкі фільм 17.00 — праграма перадач. 17.05 — школьная фільматэка. «Гора ад розуму». Фільм-спектакль. Першая серыя. 18.20 — сельскія навіны. «Дажынкі». Кінарэпартаж з калгаса імя XXII з'езда КПСС Гомельскага раёна. Трансляцыя на Маскву. 18.50 — тэлевізійныя навіны. 19.00 — спартыўная перадача. 19.45 — у нас у гасцях радыёстанцыя «Юнацтва». 20.15 — «На дачы». Кароткаметражны фільм па апавяданню А. П. Чэхава. 20.45 — «Працаўнікам палёў». Канцэрт. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 —кінафестываль прыгодніцкіх фільмаў. «Чырвоныя д'ябаляты».

Другая праграма. 17.00 — для школьнікаў. «Ленінград — горад-марак». Перадача з Ленінграда. 17.35 — «Праўда пра рэлігію». Перадача з Ленінграда. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.50 — «Майстры ўкраінскай музычнай культуры». Перадача з Кіева. 19.30—«Свет сёння» (М). 20.00 — «Навіны будаўніцтва». Кіначасопіс (М). 20.10 — «Сляды ўходзяць за гарызонт». Мастацкі фільм (М). 21.30 — героі нашага часу. «Калгасны інжынер». Дакументальны фільм. 21.50—«Горад маёй вясны». Кіначасопіс. 22.00 — літаратурны аўторак. Перадача з Ленінграда.

15 верасня

Першая праграма. 11.00 — для вучняў другой змены. «Гора ад розуму». Фільм-спектакль (1-я і 2-я серыі). 16.55 — праграма перадач. 17.00 —для школьнікаў «Сто задум двух сяброў» (М). 17.30 — для школьнікаў. «Звіні, піянерская песня». Развучванне новых песень. Перадача з Палаца піянераў (М). 18.00 —тэлевізійныя навіны. 18.20 — школьная фільматэка. «Гора ад розуму». Фільм-спектакль (другая серыя). 19.40 — Дэкада балгарскай культуры ў Беларусі. «Рабочая дружба». Рэпартаж з Мінскага гадзіннікавага завода. 20.15 — «Паўднёвы вузел». Мастацкі фільм. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00—«У эфіры — «Маладосць» «Гарызонт». Перадача з Ленінграда.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20—«Фізкультура і спорт». Перадача з Ленінграда. 19.00 — тэлевізійныя фільмы па апавяданнях В. Сараяна, А. Мальца, А. Карабіцына (М) 19.50 — новае на ВДНГ (М). 20.05 — «Вячэрняя сустрэчы». Музычная перадача (М). 21.30— «Дарогай бессмяротнасці». Мастацкі фільм.

16 верасня

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00—для малышоў. «Каласок». Лялечны фільм. 17.30 — Дэкада балгарскай культуры ў Беларусі. У свеце мастацтваў. «Дзевяць дзён аднаго лета», «Творчасць». Кінанарысы. 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — канцэрт. 19.00 — урачысты вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Яна Райніса. Перадача з залы імя П. І. Чайкоўскага (М). 21.45 — эстафета навін (М).

Другая праграма. 17.00 —для школьнікаў. «Вуліца Няўзорава, 29». Перадача з г. Горкага. 17.30— для школьнікаў і малодшых школьнікаў. «Сцёпка-Растаропка і Воўка Багатыроў». Тэлевізійны фільм (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Сіла зямлі маёй». Тэлевізійны нарыс (М). 19.00 — Дэкада балгарскай культуры ў Беларусі. «Якія маладыя мы былі». Балгарскі мастацкі фільм. 20.40 — «Алма-ацінская вясна». Фільм-канцэрт.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА

на штотыднёвы інфармацыйна-бібліяграфічны часопіс Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў СССР па друку

«НОВЫЕ КНИГИ»

ЧАСОПІС

Аператыўна інфармуе чытачоў аб кнігах на рускай мове па ўсіх разделах навукі, галінах ведаў і галінах народнай гаспадаркі, якія выйшлі за тыдзень і рыхтуюцца да выпуску, цэнтральнымі і мясцовымі выдавецтвамі. Бібліяграфічныя апісанні выдадзеных кніг суправаджаюцца кароткімі анатацыямі і класіфікацыйнымі індэксамі для масавых бібліятэк.

Дапамагае прапагандыстам і агітатарам знайсці неабходны матэрыял для чарговай лекцыі ці гутаркі, выкладчыкам, настаўнікам, кіраўнікам гурткоў і семінараў у сетцы партыйнай асветы — рэкамендаваць сваім слухачам патрэбную літаратуру. — рэкамендаваць сваім

Дазваляе арыентавацца ў новых выданнях супрацоўнікам бібліятэк пры камплектаванні кніжных фондаў, кнігагандлёвым работнікам, членам саветаў садзеяння распаўсюджанню літаратуры пры кніжных магазінах і членам саветаў сяброў кнігі.

Аказвае дапамогу ў выбары кніг кнігазнаўцам, кнігалюбам, бібліёграфам і іншым чытачам, якія любяць кнігу і сочаць за кніжнымі навінкамі.

Прадастаўляе вялікі інфармацыйны матэрыял рэдакцыям газет і часопісаў для прапаганды кніг.

Падпісная цана:
на 12 мес.—5 р. 28 к.
на 6 мес.—2 р 64 к.
на 3 мес.—1 р. 32 к.

Падпіска прымаецца грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку па месцы работы, аддзеламі і агенцтвамі «Саюздруку», а таксама аддзяленнямі сувязі з любога месца без абмежаванняў.

ВЫДАВЕЦТВА «КНИГА».

«Літаратура і мастацтва» выходзіць ў аўторак і пятніцу

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-